Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

1 ЖНІЎНЯ 2019 г. ЧАЦВЕР № 143 (29010)

БЕЛАРУСКІЯ ПАХАВАННІ Ў КНЯЖАЦКІМ АРХІВЕ 7

ЗАСЦЕРАГЧЫСЯ АД ФАЛЬШЫВЫХ ГРОШАЙ 8

ЦЫТАТА ДНЯ

Максім ЕРМАЛОВІЧ, міністр фінансаў:

«Бюджэт Беларусі 2020 года прадугледжвае працяг рэалізацыі праграмы сямейнага капіталу. Устанаўліваецца памер субсідыі Br22,5 тысячы на 2020 год, зыходзячы з гэтага, мы плануем у бюджэце каля Br350 млн. Гэта будзе крыніцай фарміравання дэпазітных рахункаў шматдзетных сем'яў у 2020 годзе. Гэтыя рэсурсы таксама будуць задзейнічаны і ў эканоміцы, бо стануць крыніцамі фінансавання і крэдытавання інфраструктурных праектаў, дзяржаўных прадпрыемстваў для іх мадэрнізацыі і развіцця. Акрамя таго, у бюджэце будуць зарэзерваваныя сродкі для паскоранага вырашэння задачы па забеспячэнні жыллём шматдзетных сем'яў. У бюджэце прадугледжваюцца субсідыі на патанненне кошту жылля, субсідаванне працэнтных ставак для канкрэтных атрымальнікаў».

КОЛАС ВЫШЭЙ ЗА ПОЯС

Фота БелТА.

Трэці сезон дапамагае бацьку на ўборцы збожжавых у ААТ «Следзюкі» Быхаўскага раёна студэнтка чацвёртага курса Беларускай дзяржаўнай ордэнаў Кастрычніцкай Рэвалюцыі і Працоўнага Чырвонага Сцяга сельскагаспадарчай акадэміі (БДСГА) Валерыя Панцялеева.

На здымку: Віталій і Валерыя ПАНЦЯЛЕЕВЫ.

Праблемы і рашэнні

Адзіны нумар 115 і службы заказчыкаў

Камунальнікі Міншчыны ўдасканальваюць свае паслугі

Як працуе жыллёва-камунальная гаспадарка цэнтральнага рэгіёна, што выконваецца, а што не, і што робіцца, каб палепшыць становішча — гэтыя і іншыя пытанні праналізавалі падчас пасяджэння Мінаблвыканкама.

У межах Дзяржаўнай праграмы «Камфортнае жыллё і спрыяльнае асяроддзе» на 2016—2020 гады Мінскі абласны Савет дэпутатаў зацвердзіў рэгіянальны комплекс мерапрыемстваў.

— Фінансаванне іх ажыццяўляецца рытмічна: за першае паўгоддзе 2019 года накіравана 130,5 мільёна рублёў з бюджэту. Разам з тым з дванаццаці паказчыкаў выкананы сем. У Дзяржынскім, Салігорскім, Чэрвеньскім раёнах не рэалізавана па шэсць запланаваных пунктаў, у астатніх раёнах — па два-тры. Чаму? Справа ў абыякавасці ці ў нечым іншым? — звярнуўся да прысутных старшыня Мінаблвыканкама Анатоль ІСАЧАНКА.

— Вельмі актуальнае пытанне — забеспячэнне жыхароў Міншчыны якаснай пітной вадой. За першы квартал 2019-га пры заданні 91,3 % фактычны паказчык склаў 90,8 %. Але да канца года плануем пабудаваць 40 станцый абезжалезвання ў пятнаццаці раёнах вобласці, што дазволіць палепшыць сітуацыю. Для гэтага прымаюцца неабходныя захады: распрацаваны мерапрыемствы, графікі ўводу ў дзеянне аб'ектаў, — запэўніў **начальнік упраўлення жыллёва-камунальнай гаспадаркі, энергетыкі і паліва Мінаблвыканкама Аляксандр ЯХНАВЕЦ.** — Што датычыцца замены водаправодных і каналізацыйных сетак, то ў першым паўгоддзі ў некаторых раёнах работы вяліся нізкімі тэмпамі, а ў асобных да іх наогул не прыступалі. Прычына — у зрыве тэрмінаў распрацоўкі праектна-каштарыснай дакументацыі.

СТАР. 4

Лад жыцця

...І НІЯКАЙ ЭКЗОТЫКІ!

Модныя трэніроўкі для людзей з інваліднасцю

У Лідскай дзіцяча-юнацкай спартыўнай школе № 4 нядаўна афіцыйна адкрылася інклюзіўная спартыўная зала з безбар'ерным асяроддзем.

Першы ў нашай краіне **інструктар інклюзіўнага краснафіта Віктар ЗАХАРАЎ,** сам калясачнік з 2001 года, нават пераехаў на час праекта з Барысава ў Ліду, каб праводзіць заняткі з мясцовымі жыхарамі. У кастрычніку збіраецца ў Мінск — трэніраваць людзей у сталічным клубе «Панда краснафіт». «Калі не ажанюся тут і не застануся», — усміхаецца ён.

СТАР. 5

КАРАТКА

• Нацыянальны аэрапорт Мінск з 1 жніўня запускае новую паслугу для пасажыраў міжнародных рэйсаў — FastTrack. Сэрвіс дазволіць прайсці перадпалётны дагляд пасля рэгістрацыі ў прыярытэтным парадку.

• **У Мінску ў 2019 годзе на добраўпарадкаванне выдаткуюць з бюджэту Br10 млн.**

• На тэрыторыі нафтабазы ў Брэсце ўчора гарэў палівазапраўшчык. Пажар ліквідаваны, пацярпелых не было.

ISSN 1990 - 763X

УКРАІНА МОЖА РАЗЛІЧВАЦЬ НА БЕЛАРУСЬ ЯК ПРЫХІЛЬНІЦУ МІРУ

Учора адбылася тэлефонная размова Аляксандра Лукашэнкі з Уладзімірам Зяленскім. Пра гэта паведамляе афіцыйны сайт Прэзідэнта Беларусі.

Аляксандр Лукашэнка павіншаваў украінскага калегу з паспяховым правядзеннем палітычных кампаній, пажадаўшы поспехаў у фарміраванні органаў улады і ў цэлым у далейшай рабоце.

Уладзімір Зяленскі яшчэ раз пацвердзіў запрашэнне, накіраванае раней на адрас кіраўніка беларускай дзяржавы, наведаць Украіну ў рамках II Форуму рэгіёнаў Беларусі і Украіны, які адбудзецца ў кастрычніку гэтага года ў Жытоміры. Аляксандр Лукашэнка запрашэнне прыняў, адзначыўшы, што як ініцыятар і суаўтар згаданага мерапрыемства бачыць яго высокую эфектыўнасць і карысць для эканомік абедзвюх краін.

Акрамя таго, Уладзімір Зяленскі падрабязна расказаў Прэзідэнту Беларусі аб сітуацыі ў Данбасе і падзякаваў за арганізацыю эфектыўнай перагаворнай пляцоўкі і ў цэлым за тую ролю, якую адыгрывае Беларусь у справе ўрэгулявання гэтага канфлікту. Беларускі лідар у сваю чаргу запэўніў, што Мінск працягне і ў далейшым прыкладаць усе намаганні для ўрэгулявання сітуацыі ў рэгіёне, і Украіна заўсёды можа разлічваць на Беларусь як краіну — прыхільніцу мірных ініцыятыў і працэсаў.

Асобным комплексам падчас размовы былі абмеркаваныя пытанні эканамічнага ўзаемадзеяння і гандлю, у прыватнасці развіццё супрацоўніцтва ў сферы прамысловасці, сельскай гаспадаркі. Тут прэзідэнты асаблівую ўвагу аддалі ходу ўборачнай кампаніі ў абедзвюх краінах. Яшчэ адной асобнай тэмай размовы стала ўзаемадзеянне і забеспячэнне нацыянальнай бяспекі абедзвюх краін у энергетычнай сферы.

Уладзімір Зяленскі таксама павіншаваў Аляксандра Лукашэнку з бліскучым правядзеннем II Еўрапейскіх гульняў, падкрэсліўшы, што ва Украіне сачылі і за ходам спаборніцтваў і, безумоўна, за выступленнем сваіх спартсменаў. Аляксандр Лукашэнка ў адказ павіншаваў калегу з высокім вынікам украінскай зборнай.

У фінале размовы Аляксандр Лукашэнка запрасіў Прэзідэнта Украіны наведаць Беларусь у любы час і ў любым фармаце. Уладзімір Зяленскі гэта запрашэнне з задавальненнем прыняў.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

На слыху

Лідзія ЯРМОШЫНА:

«Конкурс на парламенцкіх выбарах складзе больш за чатыры чалавекі на месца»

Такое меркаванне старшыня беларускага Цэнтрвыбаркама выказала ў эфіры тэлеканала «Беларусь 1», паведамляе БелТА.

Фота БелТА.

«Калі будуць зьвесткі пра колькасць зарэгістраваных ініцыятыўных груп, мы зможам дакладна казаць пра конкурс. І то не ведаем, колькі нам партыі дадуць кандыдатаў. Але думаю, што выбары будуць абавязкова альтэрнатыўныя, — сказала Лідзія Ярмошына. — Калі возьмем выбары 2016 года, у нас было на дзень выбараў 484 кандыдаты. Гэта менш, чым у 2000-м, але значна больш, чым было ў 2008-м і 2012 гадах. Таму, думаю, будзе каля 500 кандыдатаў, гэта значыць, дзесьці 4,5 чалавека на месца».

Па словах старшыні ЦВК, палітыка дзяржавы накіравана на тое, каб каля 30 % дэпутацкіх вакансій запаўняліся «старасслужачымі — тымі, хто пераходзіць у наступны склад парламента, што дае стабільнасць, прафесіяналізм органу з самых першых дзён працы ў новым скліканні». З такімі кандыдатамі ўжо праводзяць гутаркі і высвятляюць, ці жадаюць яны вылучацца і ці будуць іх падтрымліваць. «Таму, лічу, можна гаварыць пра 30 ці крыху больш працэнтаў тых, хто пяройдзе ў наступнае дэпутацкае скліканне», — дадала Лідзія Ярмошына.

Ва ўрадзе

ПРАЦУЕМ НЕДАСТАТКОВА ЭФЕКТЫЎНА?

На пасяджэнні Савета Міністраў вызначаны эканамічныя задачы на 2020 год

«Увесь пакет прагнозных дакументаў тыдзень таму быў дэталёва разгледжаны і ў цэлым адобраны на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў, узнятыя пытанні адпрацаваны з зацікаўленымі. Сёння ў асноўным дасягнута разуменне па ключавых пытаннях», — падвёў вынікі абмеркавання Сяргей РУМАС. Пры фарміраванні падыходаў да прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця на 2020 год выкарыстоўвалася два сцэнарыі: мэтавы для прагнозу і базавы — для бюджэту.

Кіраўнік урада звярнуў увагу, што на днях эксперты з МВФ і Сусветнага банка зноў знізілі чаканні па росце сусветнай эканомікі на 2019—2020 гады. Запавольваецца еўразона, гандлёвыя войны паміж ЗША і Кітаем вядуць да ўзмацнення канкурэнтнай барацьбы на шэрагу рынкаў, адчувальных для беларускіх вытворцаў. Геапалітычная напружанасць дэстабілізуе сыравінныя рынкі і вядзе да адкладзенага попыту на інвестыцыйныя тавары. «Усё гэта стварае сур'ёзныя выклікі для ўстойлівай работы эканомікі краіны як у бягучым годзе, так і ў 2020-м», — адзначыў Сяргей Румас.

Ключавымі паказчыкамі эфектыўнасці работы ўрада і Нацбанка на 2020 год прапануецца вызначыць тэмп росту ВУП — 102,5 працэнта, тэмп росту прадукцыйнасці працы — 102,1 працэнта, прыцягненне прамых замежных інвестыцый у аб'ёме 1,7 мільярда долараў, інфляцыя за год не павінна перавысіць 5 працэнтаў.

Рэальныя наяўныя даходы насельніцтва ў 2020 годзе павінны вырасці на 2,4 працэнта, тэмп росту рэальнай заработнай платы пры гэтым чакаецца на ўзроўні 102,1 працэнта. Экспарт тавараў і паслуг прырасце на 3,3 працэнта, гэта значыць, што ў наступным годзе пастаўкі на знешнія рынкі павінны вырасці на 1,4 мільярда долараў у параўнанні з вынікамі бягучага года. Сальда знешняга гандлю прагназуецца станоўчым на ўзроўні аднаго працэнта ВУП.

«Як відаць з прыведзеных параметраў, асноўны акцэнт — на забеспячэнне макраэканамічнай збалансаванасці», — звярнуў увагу прэм'ер-міністр. Для росту эканомікі неабходна вырашыць некалькі ключавых пытанняў. «Першае з іх — прадукцыйнасць працы. Паводле ацэнкі Мінэканомікі, сёння яна складае менш за палавіну ад узроўню краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. Гэта прамая ацэнка канкурэнтаздольнасці нашай эканомікі. Другое — высокая затратнасць эканомікі, гэтае пытанне цесна ўвязана з папярэднім. Відавочна — калі не разбяромся з затратамі, то не выйдзем з зоны нізкай прадукцыйнасці працы і заработных плат, — падкрэсліў Сяргей Румас. — Яшчэ адно пытанне — развіццё прадпрымальніцтва і работа з інвестарамі. Заканадаўства ёсць, пытанне толькі ў практычнай рабоце на месцах».

Паводле прэс-службы Савета Міністраў і БелТА.

ДЗЯРЖАЎНЫ ДОЎГ ЗНІЗІЎСЯ

Знешні дзяржаўны доўг Беларусі на 1 ліпеня 2019 года склаў $16,7 млрд. Такім чынам ён знізіўся з пачатку года на $0,2 млрд (з улікам курсавых розніц), або на 1,2 працэнта, паведамілі БелТА ў Міністэрстве фінансаў.

У студзені—чэрвені прыцягнуты знешнія дзяржаўныя пазыкі на суму $486,4 млн, у тым ліку $398 млн — урада і банкаў Расіі, $50,3 млн — МБРР, $22,3 млн — Экспартна-імпартнага банка Кітая, $15,8 млн — ЕБРР і Паўночнага інвестыцыйнага банка (ПІБ).

Пагашэнне знешняга дзяржаўнага доўгу за шэсць месяцаў 2019 года склала $773,7 млн, з якіх $311,9 млн — ураду Расіі, $247,2 млн — Экспартна-імпартнаму банку Кітая, $176,5 млн — ЕФСР, $36,6 млн — МБРР, $0,8 млн — ЕБРР і ПІБ, $0,7 млн — Таварна-крэдытнай карпарацыі ЗША.

Дзяржаўны доўг Беларусі на 1 ліпеня склаў Br43,1 млрд і зменшыўся ў параўнанні з пачаткам 2019 года на Br2,3 млрд, або на 5 працэнтаў. Унутраны дзяржаўны доўг па стане на 1 ліпеня склаў Br9 млрд, павялічыўшыся з пачатку года на Br0,1 млрд (з улікам курсавых розніц), або на 1,2 працэнта.

За студзень—чэрвень 2019 года размешчана ўнутраных валютных дзяржаўных аблігацый для юрыдычных і фізічных асоб на суму, эквівалентную $527,9 млн. Пагашана валютных і рублёвых дзяржаўных аблігацый для юрыдычных і фізічных асоб на суму, эквівалентную $160,3 млн і Br227,2 млн.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

КНДР здзейсніла другі ракетны запуск за тыдзень

Паўночная Карэя запусціла дзве балістычныя ракеты малой дальнасці з раёна порта Вансан на ўсходнім узбярэжжы краіны. Гэта ўжо другі пуск у КНДР за тыдзень. Ракеты праляцелі 250 кіламетраў, дасягнуўшы вышыні каля 30 кіламетраў, і ўпалі ў Японскае мора, паведаміў Аб'яднаны камітэт начальнікаў штабоў Паўднёвай Карэі. Па словах міністра абароны Паўднёвай Карэі Чжон Кён Ду, ракеты адрозніваліся ад тых мадэляў, якія былі запушчаны раней. Прэм'ер-міністр Японіі Сіндзя Абэ заявіў, што ніякай пагрозы для бяспекі краіны паўночнакарэйскія ракеты не ўяўлялі. Раней КНДР запусціла дзве ракеты малой дальнасці, адна з якіх праляцела каля 690 кіламетраў, а другая — 430 кіламетраў. Гэта быў першы запуск пасля сустрэчы лідара Паўночнай Карэі Кім Чэн Ына з прэзідэнтам ЗША Дональдам Трампам у раёне дэмілітарызаваных зоны, якая падзяляе дзве Карэі. Тады яны дамовіліся працягнуць перагаворы па дэнуклеарызацыі. Эксперты мяркуюць, што ў бліжэйшы час можна чакаць новых запускаў.

ААН: саюзнікі НАТА забілі больш афганцаў, чым талібы

У першай палове 2019 года ў выніку дзеянняў афганскай арміі і войскаў НАТА ў Афганістане загінула больш грамадзянскага насельніцтва, чым ад рук баевікоў «Талібана» і «Ісламскай дзяржавы», вынікае са справаздачы Арганізацыі Аб'яднаных Нацый (адпаведна 717 і 531 чалавек). У красавіку звесткі аб падобных суадносінах ахвяр з'явіліся ў ААН адносна першай чвэрці гэтага года, цяпер трэнд пацвярджаецца. Такую карціну ў арганізацыі назіраюць упершыню з моманту, калі больш за 10 гадоў таму пачаўся падлік ахвяр сярод грамадзянскага насельніцтва ў Афганістане. Зніжэнне колькасці забітых баевікамі тлумачыцца скарачэннем колькасці нападаў падрыўнікоў-смяротнікаў. Рост колькасці ахвяр ад рук праўрадавых сіл — актывізацыяй дзеянняў ваеннай авіяцыі і пошукава-разведвальных аперацый. У выніку авіяналётаў (у асноўным амерыканскай авіяцыі) за гэты перыяд загінулі 363 мірныя жыхары, у тым ліку 89 дзяцей, вынікае з даных Місіі ААН па садзейнічанні Афганістану (UNAMA).

У Калумбіі канфіскавалі больш за тону какаіну, які хацелі адправіць у Еўропу

Узброеныя сілы Калумбіі канфіскавалі больш за тону какаіну, які прызначаўся для адпраўкі ў Бельгію, паведамляе канал Noticias RCN са спасылкай на заяву вайскоўцаў. Аперацыя па канфіскацыі какаіну праводзілася ў муніцыпалітэце Пальміра, размешчаным у дэпартаменце Валье-дэль-Каўка. З дапамогай спецыяльна навучанага сабакі падчас агляду грузавіка былі выяўленыя наркотыкі, схаваныя ў кансервах з садавіной. «Пасля правядзення інспекцыі сумесна з генпракуратурай... паведамляецца, што з 50 тысяч слоікаў, якія знаходзіліся ў кантэйнеры транспартнага сродку, больш за 2,9 тысячы ўтрымлівалі вадкі какаін», — агучыў заяву тэлеканал. Пазней стала вядома, што агульная вага наркотыкаў склала 1,1 тысячы кілаграмаў. Іх адабранне, па словах калумбійскіх ваенных, «з'яўляецца самым моцным ударам па транспарціроўцы наркотыкаў сёлета». Па звестках узброеных сіл, наркотыкі павінны былі накіравацца ў Еўропу паўстанцамі з Рэвалюцыйных узброеных сіл Калумбіі (РУСК).

Будзь у курсе!

Фізасобам — права на рэалізацыю зброі

Прыняты закон аб змене законаў у сферы вядзення паляўнічай гаспадаркі і паляванні.

Па інфармацыі Нацыянальнага прававога інтэрнэт-партала Рэспублікі Беларусь, дакументам удасканалены парадак выканання адміністрацыйнага спагнання ў выглядзе пазбаўлення спецыяльнага права за парушэнне правілаў вядзення паляўнічай гаспадаркі і паляванні ў частцы, што датычыцца анулявання і паўторнага атрымання дазволу на грамадзянскую зброю.

У прыватнасці, прадугледжваецца ўвядзенне адміністрацыйнага спагнання ў выглядзе папярэджання за нязначныя парушэнні ў сферы вядзення паляўнічай гаспадаркі і паляванні з адначасовым узмацненнем жорсткасці мер адказнасці за найбольш грубыя правапарушэнні (аж да пазбаўлення спецыяльнага права) і канкрэтызацыяй адпаведных адміністрацыйных саставаў.

Згодна з законам, фізічныя асобы надзяляюцца правам рэалізацыі наяўнай у іх на законных падставах зброі, яе бязвыплатнай перадачы арганізацыям, якія маюць права на абарот зброі (напрыклад, воінскім фарміраванням, арганізацыям фізічнай культуры і спорту), з паведамленнем органам унутраных спраў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

На свае вочы

З наземным вестыбюлем і травалатарамі,

або Якой будзе станцыя метро «Вакзальная»



Пакуль механізаваны тунэлепраходчы комплекс «Алеся» пераадольвае 1270 метраў крайняга тунэля ад «Вакзальнай» у напрамку «Кавальскай слабады», на будучых станцыях трэцяй лініі таксама кіпіць работа. На «Юбілейнай плошчы» ўзводзяць маналітныя канструкцыі, а на «Плошчы Францішка Багушэвіча» нядаўна прыступілі да аздаблення. Апошнія штрыхі засталося ўнесці на «Кавальскай слабадзе». Даганяе яе па працэнце гатоўнасці ў будучым самая гасцінная станцыя — «Вакзальная», на якую і адправіліся карэспандэнты БелТА.

Любая станцыя метро пачынаецца з вестыбюля. На «Вакзальнай» ён будзе цалкам наземным. Прасторны будынак у зялёна-чорных танах размяшчаецца за чыгуначным вакзалам. Побач будуецца вялікі паркінг і забаўляльны цэнтр — усё ў адным стылі. У аздобленні вестыбюля будзе шмат шкла, асабліва трывалага, з керамічным напыленнем, дах упрыгожыць невялікі шкляны купал. Тут размесцяцца білетныя касы, большасць службовых памяшканняў. Прадугледжана стварэнне безбар'ернага асяроддзя: у холе абсталяваны ліфтавая шахта і пандусы для заезду на запрашальныя пляцоўкі.

а травалатары ўпершыню спецыяльна для Мінскага метрапалітэна вырабілі на заводзе ў Магілёве.

Цікава, што абодва тунэлі, якія злучаюць станцыі, праходзяць пад чыгуначнымі шляхамі. **Намеснік галоўнага інжынера тунэльнага атрада №1 УП «Мінскметрабуд» Андрэй СЕРАФІМОВІЧ** адзначае, што пры будаўніцтве гэтых тунэляў «Алесю» не прыцягвалі, пешаходныя пуці праклалалі з дапамогай немеханізанага шчыта ЩН-1с. Для таго каб пераадолець адлегласць у адзін метр, змене спатрэбілася каля сямі гадзін. Да таго ж у мэтах бяспекі, каб пазбегнуць абвалаў, даводзілася браць дазвол на праходку пад кожным з шляхоў, працавалі ноччу або ў іншыя рэдкія часіны, калі на чыгунцы мінімальная нагрузка.

«Калі зараз павярнуць направа, за сцяною знаходзіцца станцыя «Плошча Леніна», куды мы будзем уразацца, — працягвае экскурсію Андрэй Серафімовіч. — Будзем праходзіць пад дзеючай станцыяй. Калі дойдзем да сярэдзіны, пачнем выхад уверх. Тут плануем працаваць па чатыры гадзіны ў суткі (пасля таго як ноччу будзе знята напружанне з кантактнай рэйкі) — такое акно штодня нам будзе прадастаўляць метрапалітэн у мэтах бяспекі пасажыраў. У хуткім часе пад платформай на «Плошчы Леніна» будзе высякацца і ўзмацняцца металічнымі рамамі сцяна». Аказваецца, ужо пры распрацоўцы першай лініі праекціроўшчыкі прадугледзелі такі план развіцця падзей пры будаўніцтве трэцяй лініі падземкі. Гэтым дальнабачнасць беларускіх спецыялістаў не абмежавалася. Падобныя злучальныя хады на некаторых станцыях прадугледжаны і пад будаўніцтва чацвёртай лініі.

Праз лабірынты станцыі (без суправаджэння тут можна лёгка заблукаць) вяртаемся на платформу. Заўважаем яркае святло ў канцы аднаго з тунэляў. Там размясціўся рэйказварачны пост. У працэсе зваркі выкарыстоўваюцца новыя тэхналогіі, дзякуючы якім будучы шлях для цягнікоў атрымліваецца бясшвоўным. Месца стыку максімальна згладжваецца, каб не было ніякіх зазораў. Гэта дазволіць зрабіць беларускае метро практычна бясшумным, як і ў многіх еўрапейскіх гарадах.

Будаўніцтва ўсіх станцый павінна ісці строга па зацверджаным графіку. Ужо ў снежні гэтага года і пачатку студзеня наступнага на «Вакзальнай» будзе праводзіцца тэставанне ўсяго абсталявання. А ў пачатку студзеня будучага года плануецца пробны запуск цягніка. Пасажыраў новая трэцяя лінія прыме ўжо ў сярэдзіне 2020 года.

Фота прадстаўлена БелТА.

Спускаемся на платформу — тут укладваюць граніт. З 1 жніўня адначасова з аздабленнем вестыбюля пачнецца афарбоўка сцен, да верасня спецыялісты плануюць заняцца падсветкай, мантажом рэечнай столі. Станцыя візуальна здаецца досыць прасторнай, і гэта сапраўды так: «Вакзальная» шырэй іншых станцый на некалькі метраў, што абумоўлена вялікім пасажырапатокам. Ужо ўстаноўлены каркасы для эскалатараў даўжынёй каля 10 метраў, прыступкі зманціруюць пазней.

Навінкай сталічнага метрапалітэна стануць травалатары ў двух пераходах, якія злучаць станцыі «Вакзальная» і «Плошча Леніна». Пасажыр зможа абраць, як яму зручней пераадолець гэтую адлегласць: пешшу альбо пры дапамозе травалатара. Дарэчы, і травалатары, і эскалатары — беларускія. Эскалатары вырабляюць у Салігорску,

Не прапусці!

Сабрацца ў школу і не спустошыць бюджэт

Дзіцячы маркет «РэчыДарэчы Junior», прысвечаны падрыхтоўцы да школьнага сезона, пройдзе ў Галерэі сучаснага мастацтва «Ў» 24—25 жніўня.

У бацькоў будзе выдатная магчымасць пазбавіцца ад рэчаў, цацак і кніг, з якіх «выраслa» дзіця, і набыць да новага навучальнага года нешта патрэбнае і натхняльнае. На маркеце можна будзе прадаць, купіць, абмяняць ці падарыць рэчы, якія могуць прынесці карысць каму-небудзь яшчэ, а таксама набыць новыя рэчы, канцылярскія тавары, кнігі, навучальныя дапаможнікі і гульні, якія адпавядаюць узросту дзіцяці.

Для бацькоў у рамках маркету будуць арганізаваны карысныя лекцыі пра развіццё мозга дзіцяці, узроставыя крызісы, актыўнае мацярынства, правільнае харчаванне, булінг у школе і многае іншае. Яны змогуць атрымаць кансультацыю псіхолага, лагапеда, педыятра, даведацца, што новага з'явілася ў сферы альтэрнатыўнай адукацыі: пра спартыўныя секцыі, школы англійскай мовы, студыі ранняга развіцця.

Для дзяцей будуць арганізаваныя буккросінг, дзіцячая пляцоўка, гульні і майстар-класы, знаёмства з музычнымі інструментамі і чытанне ўслых.

Да ўдзелу запрашаюцца ўсе ахвотныя бацькі, установы пазашкольнай адукацыі, спартыўныя секцыі, мастацкія і музычныя школы, рамеснікі і індывідуальныя прадпрымальнікі.

Уваход на фестываль вольны. Удзел у маркеце каштуе 10 рублёў.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Стыхія

Смяротная маланка

Паблізу вёскі Глушкавічы Лельчыцкага раёна, як мяркуецца, разрадам маланкі смяротна траўмавана жанчына. Такая інфармацыя размешчана на сайце Дзяржкамітэта судовых экспертыз, паведамляе БелТА.

Трагедыя адбылася, калі дзве мясцовыя жыхаркі ў час навальніцы ехалі на веласіпедах па дарозе Мілашэвічы — Глушкавічы. Прыкладна ў 14.20 у небе бліснула маланка і пенсіянерка, якая ехала наперадзе, звалілася. Другая жанчына спынілася, каб дапамагчы ёй, але тая ўжо не падавала прыкмет жыцця. Яе вопратка была абпалена ў некалькіх месцах.

Пры правядзенні судова-медыцынскай экспертызы на целе загінулай эксперт выявіў сляды, характэрныя для паражэння электрычным токам. Дадатковыя даследаванні дазволяць устанавіць дакладную прычыну смерці.

Як паведамілі ў Дзяржкамітэце, удары маланак выключна небяспечныя. Яе ўдар смяротны для ўсяго жывога, праўда, у людзей і жывёл маланка трапляе параўнальна рэдка і толькі ў тых выпадках, калі сам чалавек з-за сваёй бяспечнасці ці няведання стварае для гэтага спрыяльныя ўмовы.

Важна разумець, што маланка заўсёды рухаецца да зямлі самым кароткім шляхам і часцей за ўсё б'е ў высокія прадметы, а з двух прадметаў аднолькавай вышыні — у той, які з'яўляецца лепшым правадніком. На вуліцы варта трымацца далей ад высокіх дрэў, якія растуць асобна, слупоў, ліній электраперадач, а таксама ад вогнішча, бо слуп гарачага паветра — добры праваднік электрычнасці. Акрамя таго, у непагадзь нельга знаходзіцца ў вадзе, а рыбалку падчас навальніцы трэба адразу ж кінуць.

На кантролі

ПЕРАПЛАЦІЛІ ЗА ПРЫБОРКУ

Жыльцы дамоў у глыбінцы пераплачвалі за прыборку ў пад'ездах. Гэта і высветлілі супрацоўнікі Камітэта дзяржаўнага кантролю Віцебскай вобласці.

Як растлумачыў «Звяздзе» **начальнік управлення кантролю за работай галін гаспадаркі камітэта Вадзім ВАЛОВІЧ,** мінская фірма выйграла конкурс на навядзенне парадку і падтрыманне чысціні ў шматпавярховіках. Трэба было гэта рабіць прыблізна ў 145 дамах у Паставах, дзе жыве каля 10 тысяч чалавек. Між іншым, гэта прыкладна палова насельніцтва горада.

У якасці арганізатара конкурсу і потым заказчыка паслугі выступала УП ЖКГ Пастаўскага раёна. Гэтая арганізацыя з'яўляецца ўпаўнаважанай па кіраванні нерухомасцю сумесных домаўладанняў.

Па ўмовах тэндара кошт заказу на санітарнае ўтрыманне дапаможных памяшканняў плошчай 32,2 тысячы квадратных метраў склаў 58,9 тысячы рублёў. Значыць, цана прыборкі за «квадрат» павінна была складаць 0,1525 рубля ў месяц.

— Але ж па ўмовах дагавора кошт паслуг вызначаны зыходзячы з колькасці грамадзян. Для іх прыняты гранічна дапушчальны тарыф на паслугу пры адсутнасці адпаведнага эканамічнага абгрунтавання. І гэта прывяло да пераплаты ў першым квартале бягучага года ў памеры 4,2 тысячы рублёў, — працягвае суразмоўца.

Падчас ажыццяўлення кантрольных мерапрыемстваў таксама высветлілі, што дагаворам была замацавана перыядычнасць работ меншая, чым прадугледжана заканадаўствам (пастанова Мінжылкамгаса ад 03.12.2010 № 25). Сухую прыборку трэба рабіць штодня, а ў дамове было падпісана — не радзей за два разы на тыдзень; вільготная прыборка — не радзей за два разы на месяц (замест штотыднёвай).

Пры гэтым акты аказання паслуг фактычна падпісваліся ў аднаго з жыльцоў, а не прымаліся заказчыкам.

Камітэтам дзяржкантролю прапанавана УП ЖКГ Пастаўскага раёна прывесці дагавор у адпаведнасць з умовамі конкурсу па цане і парадку прыёму і кантролю выкананых работ. Таксама патрабуецца было зрабіць перараслік аплаты.

Старшыні райвыканкама прапанавана забяспечыць прыцягненне да дысцыплінарнай адказнасці службовых асоб з ЖКГ аж да звальнення. З вінаватых — спагнаць лішак выплачаных сродкаў за фактычна не аказаныя паслугі.

Як падкрэслілі ў кантралюючым ведамстве, у мэтах папярэджання аналагічных недахопаў і парушэнняў у іншых рэгіёнах Віцебскаму аблвыканкаму прапанавана забяспечыць вывучэнне сітуацыі ў цэлым па вобласці.

Дарэчы, паводле інфармацыі аддзела па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб аблвыканкама, на пачатак ліпеня на прамую тэлефонную лінію найбольш часта звяртаюцца па пытаннях ЖКГ, жыллёвага фонду. У першым паўгоддзі гэтага года такіх было 130, або 44 % з усіх 295 «сігналаў» ад заяўнікаў. Для параўнання, на другім месцы праблемы, звязаныя з дарогамі, — 10 % зваротаў.

Праінфарміраваў дзяржкантроль аб выніках кантрольных мерапрыемстваў Міністэрства ЖКГ. Таксама ўнесены прапановы па карэкціроўцы існуючага заканадаўства.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Адзіны нумар 115 і службы заказчыкаў

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Вядома, любы спажывец хоча атрымліваць якасныя паслугі ЖКГ па прымальных цэнах. Мінскай вобласці даведзена заданне па зніжэнні затрат на аказанне жыллёва-камунальных паслуг у 2019 годзе ў памеры 12,02 мільёна рублёў, у тым ліку ў першым паўгоддзі — 6,11 мільёна. За студзень—ліпень эканомія склала 6,5 мільёна рублёў, або 105,9 % ад паўгадавога задання. У далейшым плануецца штогод зніжаць гэты паказчык за кошт устанаўлення планава-разліковых цэн, змяншэння неабгрунтаваных расходаў, вытворчых затрат, аптымізацыі штатаў супрацоўнікаў, патанення электраэнергіі.

Яшчэ адно актуальнае пытанне для Міншчыны — ачышчальныя збудаванні. Іх узвядзенне плануецца ў Заслаўі, Смалявічах, Салігорску ў межах праекта «Павышэнне эфектыўнасці і якасці камунальных паслуг». Фінансаванне будзе ажыццяўляцца за кошт пазыковых сродкаў Міжнароднага банка рэканструкцыі і развіцця. Ачышчальныя каналізацыйныя камунікацыі ў Фаніпалі, Клецку і Любані мяркуецца ўладкаваць у 2020—2025 гадах за кошт крэдытных рэсурсаў Еўрапейскага банка рэканструкцыі і развіцця. Акрамя таго, у цэнтральным рэгіёне запланаваны пуск шасці энергакрыніц на мясцовых відах паліва. Два аб'екты ўжо ўведзены ў дзеянне — у пасёлку Зялёны Бор Смалявіцкага раёна і ў вёсцы Лугавая Слабада Мінскага.

Тут стварылі службы заказчыкаў паслуг ЖКГ. На першапачатковым этапе такія структуры з'явіліся ў гарадах, дзе пражывае 100 тысяч і больш чалавек. Напрыклад, у Салігорску. Затым — у Жодзіне, Барысаўскім, Маладзечанскім і Слуцкім раёнах.

Фота БелТА

У вобласці пераймаюць усё найлепшае, новае ў сваіх калег. Напрыклад, цяпер на Міншчыне выбіраюць выканаўцаў работ і паслуг на канкурэнтнай аснове, як у сталіцы, з улікам рэгіянальных асаблівасцяў і эканамічнай мэтазгоднасці. Тут стварылі службы заказчыкаў паслуг ЖКГ. На першапачатковым этапе такія структуры з'явіліся ў гарадах, дзе пражывае 100 тысяч і больш чалавек. Напрыклад, у Салігорску. Затым — у Жодзіне, Барысаўскім, Маладзечанскім і Слуцкім раёнах. Яны кантралююць якасць і працэс аказання асноўных і дадатковых паслуг жыллёвымі і эксплуатуючымі арганізацыямі, цякучы і капітальны рамонт жыллёвага фонду, добраўпарадкаванне тэрыторый. У далейшым на базе існуючых структур плануецца стварыць міжрэгіянальныя дзяржаўныя службы заказчыкаў.

Станоўча паўплывала на сітуацыю ў сферы ЖКГ увядзенне адзінай дыспетчарскай службы.

— Грамадзяне могуць патэлефанаваць на кароткі нумар 115 са сваёй праблемай, заяўку зарэгіструюць дыспетчары, унясуць даныя ў праграмную базу. І чалавека абавязкова праінфармуюць аб выніках, — адзначыў Аляксандр Яхнавец. — Раней здаралася, што звароты маглі не зафіксаваць, забыць пра іх. Цяпер наладжана дакладная сістэма, пры якой такое выключана.

— У вобласці таксама працягваецца планамерная работа па замене ліфтавага абсталявання паводле ўказа кіраўніка дзяржавы, — канстатаваў **генеральны дырэктар дзяржаўнага аб'яднання «ЖКГ Мінскай вобласці» Васіль ШАШОК.** — У канцы 2018-га назіралася пэўнае адставанне. За першае паўгоддзе планавалася ўстанавіць 141 адзінку новага абсталявання, але заменена толькі 126 зношаных пад'ёмнікаў. Цяпер усё ідзе ў штатным рэжыме. Праўда, у розных раёнах праблему вырашаюць па-рознаму. У Маладзечанскім і Слуцкім заданні перавыкананы. Салігорскі, Вілейскі і Пухавіцкі адстаюць.

Разам з тым Васіль Шашок запэўніў, што ў трэціх квартале камунальнікі выйдуць на прагнозныя паказчыкі і да канца года заменяць 230 ліфтаў.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

Ну і ну!

«АБАКРАЛА» САМА СЯБЕ

Каб атрымаць выплату па страхоўцы

47-гадовая жанчына застрахавала сваю маёмасць і адправілася ў Нідэрланды. А па вяртанні чамусьці вырашыла, што страхоўка прападае дарма, і... інсцэніравала прапажу сваіх дарагіх рэчаў.

Мінчанка звярнулася на лінію 102 і паведаміла праваахоўнікам аб крадзяжы чамаданаў з рэчамі і каштоўнасцямі на агульную суму 4500 еўра. Яна расказала, што пасля вяртання з адпачынку на прыпыначным пункце да яе нібыта падышла незнаёмка, якая задавала пытанні аб тым, як прайсці да царквы. Пасля непрацяглай размовы з жанчынай фігурантка выявіла, што чамаданы скралі. Але сышчыкі знайшлі «зніклыя» рэчы ў яе кватэры.

Праваахоўнікам жанчына растлумачыла, што схавала чамаданы і звярнулася ў міліцыю для таго, каб у наступным атрымаць выплату па страхоўцы, бо і чамаданы, і ўсё іх змесціва было застрахавана.

Па інфармацыі Маскоўскага РУУС сталіцы, дзеянні жанчыны могуць быць кваліфікаваныя як заведама ілжывы данос. Ёй можа пагражаць пакаранне ў выглядзе абмежавання волі тэрмінам да пяці гадоў або пазбаўлення волі на такі ж тэрмін.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Здарэнне

П'ЯНЫ СКАЧОК «ЯГУАРА»

Жыхарка Брэста вырашыла прадаць свой аўтамабіль, дзеля чаго папрасіла сястру перагнаць яго з Баранавіч у Лунінец.

Апошняя выканала просьбу, паставіла «Ягуар» у двары свайго дома і дала аб'яву аб продажы машыны. Але на наступны дзень, калі з'явіўся патэнцыйны пакупнік, жанчына транспартны сродак... не знайшла. Давялося звярнуцца ў міліцыю.

Па інфармацыі УУС Брэсцкага аблвыканкама, у той жа дзень супрацоўнікі аддзялення ДАІ Лунінецкага РАУС прыбылі на месца ДТЗ з удзелам «Ягуара». Было ўстаноўлена, што сужыцель заяўніцы, непрацуючы і раней судзімы жыхар Кобрына 1978 года нараджэння, узяў ключ ад аўтамабіля і паехаў катацца. Прычым, правоў кіроўцы ў яго не было, да таго ж мужчына быў на добрым падпітку (1,5 праміле). Парушальніка змясцілі ў ізалятар часовага ўтрымання.

Сяргей РАСОЛЬКА.

НАДЕЖНЫЙ ИНФОРМАЦИОННЫЙ ПАРТНЕР
ОМ ПРЕССЫ
Организация и проведение мероприятий с участием СМИ
• пресс-конференций
• брифингов
• круглых столов
• семинаров
• пресс-туров
• международных форумов
Контактные телефоны: 287-17-93, 292-42-93
Сайт: dompressy.by
E-mail: public-pc@mail.ru

Міністр сувязі і інфарматызацыі Канстанцін ШУЛЬГАН і старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю Леанід АНФІМАЎ.

Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Беларусі выпусціла ў абарачэнне паштовую марку «100 гадоў дзяржаўнаму кантролю Беларусі».

Фота БелТА.

Праверце свае веды!

МУС запусціла анлайн-апытанне на тэму інфармацыйнай бяспекі

Упраўленне па раскрыцці злачынстваў у сферы высокіх тэхналогій Міністэрства ўнутраных спраў Беларусі запрашае прыняць удзел у анлайн-апытанні, якое распрацавана для высвятлення ўзроўню дасведчанасці грамадзян аб базавых аспектах папярэджання кіберзлачынстваў, паведамілі ў ведамстве.

— Актыўная віртуалізацыя грамадства непасрэдна ўплывае на крымінальную статыстыку. У такіх умовах праваахоўнікам важна не толькі быць засяроджанымі на супрацьдзеянні злачыннасці, але і надаваць столькі ж увагі пытанням прадухілення злачынстваў, эфектыўнай прафілактычнай рабоце з насельніцтвам. Анлайн-апытанне дапаможа нам зразумець, якія крокі ў гэтым кірунку дазволяць дамагчыся найлепшага выніку, — адзначыў начальнік упраўлення па раскрыцці злачынстваў у сферы высокіх тэхналогій Міністэрства ўнутраных спраў Вадзім Усціновіч.

Апытанне даступна па спасылцы: https://mvd.gov.by/ru/survey/11/.

У полі зроку

ПРАЦАВАЦЬ З ПРЫБЫТКАМ

Лясная галіна павінна выйсці на самафінансаванне, лічаць у Дзяржкантролі Гродзенскай вобласці

І для гэтага ёсць нямала падстаў. У рэгіёне добра вядзецца работа па ўзнаўленні лясоў, нарыхтоўцы і вытворчасці драўніны, экспартных пастаўках. Разам з тым галіна па-ранейшаму фінансуецца з бюджэту. У КДК праверылі, ці эфектыўна выкарыстоўваюцца дзяржаўныя сродкі і дзе лясгасы недапрацоўваюць.

Сапраўды, многія планавыя паказчыкі лясгасы нават перавыконваюць. Значна павялічылася за мінулы год плошча лесаўзнаўлення. На 121 % больш за план нарыхтавана драўніны, лясгасы забяспечаны шматаперацыйнай тэхнікай. І ўсё ж праверка выявіла значныя хібы ў рабоце лесагаспадарчых устаноў. Іх аказалася не так і мала.

— Лясной галіне не выпадкова аддаецца столькі ўвагі, — падкрэсліў падчас калегіі **старшыня Камітэта дзяржкантролю Гродзенскай вобласці Анатоль ДАРОЖКА.** — Амаль палова плошчы нашай краіны занята лясамі. Гэта аснова для паспяховага развіцця многіх сфер народнай гаспадаркі. І ў цэлым сама лясная галіна — прыбытковая. Ёсць шэраг даручэнняў Прэзідэнта па павышэнні эфектыўнасці работы лесагаспадарчых устаноў. Што датычыцца Гродзенскай вобласці, тут дзяржаўная праграма развіцця галіны выконваецца, разам з тым выяўлены шэраг праблемных пытанняў, якія патрабуць абмеркавання і прыняцця адпаведных мер.

У КДК звярнулі ўвагу, як выкарыстоўваюцца бюджэтныя сродкі. Аказалася, што больш за 70 тысяч рублёў летась выкарыстаны не па прызначэнні. Неабгрунтавана заніжаецца цана на рэалізаваную прадукцыю, што адбіваецца на атрыманай выручцы. Некаторыя лясгасы вялі бухгалтэрыю неналежным чынам, што прывяло да скажэння налічэння падаткаў. Выяўлены факты рэалізацыі драўніны па біржавых дагаворах без папярэдняй аплаты.

Па выніках праверкі да адміністрацыйнай адказнасці прыцягнута 80 работнікаў лясгасаў, якія заплацілі штраф у памеры 10 тысяч рублёў, на такую ж суму накладзены спагнанні на суб'екты гаспадарання.

Дзве крымінальныя справы заведзены па двух лясгасах рэгіёна, якія рэалізавалі прадукцыю без біржавых таргоў. У адным з іх — Смаргонскім вопытным лясгасе — выяўлены і іншыя парушэнні. У прыватнасці, у затраты на вытворчасць прадукцыі была ўключана амартызацыя ліній, якія прастойвалі. Увогуле ў КДК звярнулі ўвагу на стаўленне да сваіх службовых абавязкаў усёй вертыкалі лясгаса, бо сітуацыя тут не стабілізуецца ўжо некалькі гадоў.

Самым абуральным з'яўляецца парушэнне лясной заканадаўства самімі работнікамі лясгасаў. Гродзенскай абласной інспекцыяй аховы жывёльнага і раслінага свету пры Прэзідэнце Беларусі выяўлены факт вырабу самагону лесніком і яго жонкай у гушчары, дзе для гэтых мэт вялася незаконная высечка.

Усяго аб'ём незаконна ссечанай драўніны лясной фонда склаў 204 кубаметры, што ў грашовым эквіваленце складае 32 тысячы рублёў. За парушэнне лясной заканадаўства сёлета прыцягнута да адказнасці 51 службовая асоба і сем арганізацый. Ёсць факты самавольнага захопу зямель лясной фонду, у прыватнасці стварэння вадаёмаў. За пяць гадоў шкода склала больш за 220 тысяч долараў. Гэтага можна было б пазбегнуць, калі б быў належны кантроль з боку кіраўніцтва лясгасаў, лічаць у інспекцыі.

Між тым у многіх краінах лясная галіна з'яўляецца прыбытковай. Па гэтым шляху варта ісці і беларускім лесагаспадарчым установам. Пакуль у нашай краіне існуе дзяржаўнае фінансаванне. У КДК ставяць мэту — павялічыць эфект бюджэтных сродкаў і максімальна паменшыць іх выкарыстанне — каб лесагаспадарчыя аб'яднанні перайшлі на самафінансаванне, самі зарабілялі сродкі і адмовіліся ад бюджэтнай падтрымкі.

— У Гродзенскай вобласці 11 лясгасаў, — кажа начальнік аддзела Камітэта дзяржкантролю Гродзенскай вобласці Аляксандр Дабрук. — Каб выходзіць на прыбытак, трэба займацца максімальнай перапрацоўкай лесу, як таго патрабуе кіраўнік дзяржавы.

Вядома, гэта справа не такая хуткая. Пакуль краіна пастаўляе на экспарт саму драўніну. Але ў кожнай краіне больш зарабляе той, хто прадае не сыравіну, а гатовы тавар. Па словах спецыяліста КДК, варта максімальна павялічыць глыбіню перапрацоўкі.

На прыбытак будзе працаваць і сістэма аўтаматызаванага ўліку драўніны, якая ўкараняецца ў краіне. На думку спецыялістаў, такая сістэма дазволіць прадухіліць вываз драўніны па «шэрых» схемах, а таксама крадзяжы, зробіць дзейнасць лесанарыхтовак больш празрыстай — працэс будзе поўнасцю пад кантролем. Гродзенскі лясгас — адна з некалькіх лесагаспадарчых устаноў рэспублікі, якія павінны стварыць у эксперыментальным парадку макет электроннага ўліку драўніны. Аднак працэс гэты ідзе марудна, установай не праведзена ў поўнай ступені тэсціраванне ўсяго макета — выпрабаваны толькі некаторыя яго прыкладанні, у прыватнасці, нарыхтоўка драўніны. А вось ужо ўлік драўніны не ўсюды забяспечваецца ў электронным варыянце. Між тым сістэму плануецца масава ўкараніць да 2021 года.

Дадатковым рэзервам могуць стаць базы паляўнічых гаспадарак. Пакуль яны неэфектыўна выкарыстоўваюцца для прыцягвання замежных турыстаў: не ўдасканальваюцца інтэрнэт-сайты лесагаспадарчых устаноў, у прыватнасці, няма інфармацыі на замежных мовах аб паслугах, іх кошце, арганізацыі харчавання, арэндзе турыстычнага і спартыўнага інвентару, пражыванні ў паляўнічым комплексе.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

...І НІЯКАЙ ЭКЗОТЫКІ!

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Красфіт — новы і вельмі модны цяпер у Еўропе кірунак фізічнай падрыхтоўкі. Ён выкарыстоўвае прынцып кругавой трэніроўкі, у якую ўключаны і гімнастыка, і кардыянагрузкі, і цяжкая атлетыка. Гэта моцна адрозніваецца ад таго ж бодзібілдынгу ці простага фітнесу. І пры гэтым ніякіх экзатычных практыкаванняў — рухі такія ж, як і ў штодзённым жыцці. Ды і дарагіх трэнажораў для трэніровак не патрабуецца — дастаткова брусоў, турніка, штангі і гантэляў плюс пары простых трэнажораў накшталт вяслярнага і лыжнага.

КРАСФІТ — кругавая трэніроўка (гэта значыць, практыкаванні пастаянна паўтараюцца, як бы замыкаюцца ў ланцужок), якая заключаецца ў выкананні пэўнага комплексу практыкаванняў за мінімальны час. Яна ўзнікла ў ЗША і хутка набыла сусветную папулярнасць. Некаторыя называюць красфіт аналагам савецкага паняцця «агульнафізічная падрыхтоўка».

— Красфіт вельмі энергазатратны, для пахудзення ён нашмат больш эфектыўны, чым звычайны фітнес, — сцвярджае Віктар Захараў. — Для дасягнення эфекту дастаткова займацца некалькі разоў на тыдзень па 40 хвілін. Гэта таму, што чалавек выкладваецца на ўсе сто, працуючы падчас 40-хвілінай трэніроўкі практычна без адпачынку.

Віктар кажа, што любіць усё новае. Раней ён наогул арыентаваўся на экстрэмальныя віды спорту накшталт воднага матацыкла ці водных лыжаў. Сёлета ездзіў у Нарвегію, дзе навучыўся экстрэмальнаму спуску на лыжах з гор. «Але давялося на нейкі час адкласці гэтыя заняткі, бо заняўся красфітам, а ён вельмі зацягвае. Я проста «захварэў» на яго!» — смяецца Віктар.

Першы трэнер інклюзіўнага красфіту выдатна разумее асаблівасці людзей з інваліднасцю, іх патрэбы і пажаданні. А унікальная красфіт-праграма дае магчымасць падабраць практыкаванні наведвальнікам інклюзіўнай залы з улікам іх асаблівасцяў.

Аўтар ініцыятывы «Інклюзіўны красфіт» — вядомы грамадскі актывіст Аляксандр Аўдзевіч. Ініцыятыва рэалізавана пры фінансавай падтрымцы Еўрапейскага саюза ў партнёрстве з Міністэрствам аховы здароўя Беларусі. Яна накіравана на прасоўванне здаровага ладу жыцця і прафілактыку неінфекцыйных захворванняў на мясцовым узроўні. Гэта надзвычай актуальна для нашай краіны, асабліва прымаючы пад увагу той факт, што каля 90 % усіх смерцяў у нас — ад неінфекцыйных захворванняў.

Дзякуючы адмысловым трэнажорам і інвентару ў інклюзіўнай спартзале створаны ўмовы для фізічнай рэабілітацыі людзей, якія атрымалі траўмы або маюць прыроджаную інваліднасць, каб яны маглі кампенсаваць вымушаную пасіўнасць паралізаваных частак цела. Мадыфікаванае трэнажорнае абсталяванне разлічана на кругавы трэнінг для людзей з рознымі ўзроўнямі траўмаў і пашкоджанняў і дазваляе распрацоўваць індывідуальныя праграмы заняткаў.

У Лідзе на сённяшні дзень пражывае больш за 200 калясачнікаў. Пакуль у зале займаюцца каля 20 чалавек, у тым ліку сем з інваліднасцю. Таксама прыходзяць выхаванцы спартыўнай школы і проста мясцовыя падлеткі. Некаторыя прыязджаюць за 25 кіламетраў, каб толькі трапіць на трэніроўку!

Святлана БУСЬКО.

Фота атрымана ад прадстаўніцтва Еўрапейскага саюза ў Беларусі.

Открытое акционерное общество «Небанковская кредитно-финансовая организация «Белинкасгрупп»

ОТЧЕТ О ФИНАНСОВОМ ПОЛОЖЕНИИ ПО СОСТОЯНИЮ НА 31 декабря 2018 ГОДА

(в тысячах белорусских рублей)

	Примечания	31 декабря 2018 года
АКТИВЫ:		
Денежные средства и их эквиваленты	4	7,773
Средства в банках	5	26,539
Инвестиционные долговые ценные бумаги	6	8,778
Основные средства	8	76,285
Нематериальные активы		463
Прочие активы	9	1,155
ИТОГО АКТИВЫ		**120,993**
ОБЯЗАТЕЛЬСТВА И КАПИТАЛ:		
ОБЯЗАТЕЛЬСТВА:		
Прочие обязательства	10	925
ИТОГО ОБЯЗАТЕЛЬСТВА		925
СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ:		
Уставный капитал	11	121,002
Непокрытый убыток		(934)
ИТОГО СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ		**120,068**
ИТОГО ОБЯЗАТЕЛЬСТВА И СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ		**120,993**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ И ПРОЧЕМ СОВОКУПНОМ ДОХОДЕ ЗА 2018 ГОД

(в тысячах белорусских рублей)

	Примечания	2018 год
Процентные доходы	12	2,337
Процентные расходы		-
ЧИСТЫЙ ПРОЦЕНТНЫЙ ДОХОД		**2,337**
Доходы по услугам и комиссии		207
Расходы по услугам и комиссии		(2)
ЧИСТЫЙ КОМИССИОННЫЙ ДОХОД		**205**
Доходы от аренды		5,118
Доходы по перевозке и хранению		145
Прочие доходы		84
Операционные расходы	13	(8,823)
УБЫТОК ДО НАЛОГООБЛОЖЕНИЯ		(934)
Расходы по налогу на прибыль		-
ЧИСТЫЙ УБЫТОК		**(934)**
ИТОГО СОВОКУПНЫЙ УБЫТОК		**(934)**

ОТЧЕТ ОБ ИЗМЕНЕНИЯХ В СОБСТВЕННОМ КАПИТАЛЕ ЗА 2018 ГОД

(в тысячах белорусских рублей)

	Примечания	Уставный капитал	Непокрытый убыток	Итого капитал
30 марта 2018 года		-	-	-
Выпуск акционерного капитала	11	121,002	-	121,002
Убыток за год			(934)	(934)
31 декабря 2018 года		**121,002**	**(934)**	**120,068**

ОТЧЕТ О ДВИЖЕНИИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ЗА 2018 год

	Примечания	2018 год
ДВИЖЕНИЕ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ОПЕРАЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ:		
Проценты полученные		1,538
Доходы по услугам и комиссии полученные		6
Расходы по услугам и комиссии уплаченные		(2)
Прочие операционные доходы полученные		5,106
Административные и прочие операционные расходы уплаченные		(2,840)
Движение денежных средств от операционной деятельности до изменения операционных активов и обязательств		3,808
Изменение операционных активов и обязательств		
Чистое увеличение депозитов		(26,000)
Чистое увеличение прочих активов		(778)
Чистый приток денежных средств от операционной деятельности		(22,970)
ДВИЖЕНИЕ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ИНВЕСТИЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ:		
Приобретение инвестиционных ценных бумаг		(8,959)
Приобретение основных средств		(2,304)
Чистый отток денежных средств от инвестиционной деятельности		(11,263)
ДВИЖЕНИЕ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ФИНАНСОВОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ:		
Поступления от выпуска акций		42,029
Чистый приток денежных средств от финансовой деятельности		42,029
Влияние начисления резерва на денежные средства и их эквиваленты		(22)
Чистое увеличение денежных средств и их эквивалентов		7,773
ДЕНЕЖНЫЕ СРЕДСТВА И ИХ ЭКВИВАЛЕНТЫ, на начало года		-
ДЕНЕЖНЫЕ СРЕДСТВА И ИХ ЭКВИВАЛЕНТЫ, на конец года	4	7,773

В течение 2018 года часть уставного фонда (78,973 тыс. руб.) была сформирована путем внесения акционерами имущества (неденежная операция).

В течение 2018 года часть полученных процентных доходов в сумме 582 тыс. руб. размещалась на депозит (капитализировалась).

От имени Правления НКФО:

Председатель Правления **А. С. Посканной**

Главный бухгалтер **Н. А. Ероховец**

28 июня 2019 года, г. Минск

Открытое акционерное общество «Небанковская кредитно-финансовая организация «Белинкасгрупп»

Аудиторское заключение и финансовая отчетность за 2018 год

АУДИТОРСКОЕ ЗАКЛЮЧЕНИЕ

Акционерам и руководству Открытого акционерного общества «Небанковская кредитно-финансовая организация «Белинкасгрупп»

Мнение с оговоркой

Мы провели аудит финансовой отчетности Открытого акционерного общества «Небанковская кредитно-финансовая организация «Белинкасгрупп» (далее – «НКФО») (место нахождения: 220007, г. Минск, ул. Фабрициуса, 8В, дата государственной регистрации: 30 марта 2018 года, регистрационный номер в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей: 807000270), состоящей из отчета о финансовом положении по состоянию на 31 декабря 2018 года, отчета о прибылях и убытках и прочем совокупном доходе, отчета об изменениях в собственном капитале и отчета о движении денежных средств за 2018 год, а также примечаний к финансовой отчетности, состоящих из краткого обзора значимых положений учетной политики и прочей пояснительной информации.

По нашему мнению, за исключением влияния вопроса, изложенного в разделе «Основание для выражения мнения с оговоркой» нашего заключения, прилагаемая финансовая отчетность отражает достоверно во всех существенных аспектах финансовое положение НКФО по состоянию на 31 декабря 2018 года, а также ее финансовые результаты и движение денежных средств за 2018 год в соответствии с Международными стандартами финансовой отчетности («МСФО»).

Основание для выражения мнения с оговоркой

В 2018 году акционеры НКФО сформировали уставный фонд, в том числе за счет внесения недвижимого и движимого имущества в сумме 78,973 тысячи рублей (по состоянию на 31 декабря 2018 года балансовая стоимость данного имущества составляет 74,453 руб.). При первоначальном признании имущество было оценено по рыночной стоимости, определенной внешним оценщиком. По нашему мнению, методы и подходы, примененные оценщиком, в недостаточной степени используют наблюдаемую рыночную информацию, вследствие чего результаты оценки не могут быть использованы в качестве справедливой стоимости для целей подготовки финансовой отчетности по МСФО. Мы не можем оценить влияние этого несоответствия на балансовую стоимость основных средств и уставного капитала по состоянию на 31 декабря 2018 года, а также на расходы по амортизации, отраженные в отчете о прибылях и убытках за 2018 год.

Мы провели аудит в соответствии с Законом Республики Беларусь от 12 июля 2013 года № 56-З «Об аудиторской деятельности», национальными правилами аудиторской деятельности и Международными стандартами аудита («МСА»). Наши обязанности в соответствии с этими стандартами указаны в разделе «Ответственность аудитора за аудит финансовой отчетности» нашего заключения. Мы независимы по отношению к НКФО в соответствии с Кодексом этики профессиональных бухгалтеров Совета по международным стандартам этики для бухгалтеров («Кодекс») и этическими требованиями, применимыми к нашему аудиту финансовой отчетности в Республике Беларусь. Нами также выполнены прочие этические обязанности, установленные этими требованиями и Кодексом. Мы полагаем, что получили достаточные и надлежащие аудиторские доказательства для выражения мнения с оговоркой.

Ключевые вопросы аудита

Ключевые вопросы аудита – это вопросы, которые, согласно нашему профессиональному суждению, были наиболее значимыми для аудита финансовой отчетности за отчетный период. Эти вопросы рассматривались в контексте нашего аудита финансовой отчетности в целом и при формировании нашего мнения об этой отчетности. Мы не выражаем отдельного мнения по этим вопросам.

Мы определили, что за исключением вопроса, изложенного в разделе «Основание для выражения мнения с оговоркой», иные ключевые вопросы аудита, о которых необходимо сообщить в нашем заключении, отсутствуют.

Ответственность руководства и лиц, отвечающих за корпоративное управление, за финансовую отчетность

Руководство отвечает за подготовку и достоверное представление финансовой отчетности в соответствии с МСФО и за систему внутреннего контроля, которую руководство считает необходимой для подготовки финансовой отчетности, не содержащей существенных искажений вследствие недобросовестных действий или ошибок.

При подготовке финансовой отчетности руководство отвечает за оценку способности НКФО непрерывно продолжать деятельность, за раскрытие в соответствующих случаях сведений, относящихся к непрерывности деятельности, и за составление отчетности на основе допущения о непрерывности деятельности за исключением случаев, когда руководство намеревается ликвидировать НКФО, прекратить его деятельность или когда у руководства отсутствует практическая альтернатива ликвидации или прекращению деятельности НКФО.

Лица, ответственные за корпоративное управление, отвечают за надзор за подготовкой финансовой отчетности НКФО.

Ответственность аудитора за аудит финансовой отчетности

Наша цель состоит в получении разумной уверенности, что финансовая отчетность не содержит существенных искажений вследствие недобросовестных действий или ошибок, и в выпуске аудиторского заключения, содержащего наше мнение. Разумная уверенность – это высокая степень уверенности, но она не гарантирует, что аудит, проведенный в соответствии с МСА, всегда выявит существенные искажения при их наличии. Искажения могут быть результатом недобросовестных действий или ошибок и считаются существенными, если можно обоснованно предположить, что в отдельности или в совокупности они могут повлиять на экономические решения пользователей, принимаемые на основе финансовой отчетности.

В рамках аудита, проводимого в соответствии с МСА, мы применяем профессиональное суждение и сохраняем профессиональный скептицизм на протяжении всего аудита. Кроме того, мы:

выявляем и оцениваем риски существенного искажения финансовой отчетности вследствие недобросовестных действий или ошибок; разрабатываем и проводим аудиторские процедуры в ответ на эти риски; получаем аудиторские доказательства, достаточные и надлежащие для выражения нашего мнения. Риск необнаружения существенного искажения в результате недобросовестных действий выше, чем риск необнаружения существенного искажения в результате ошибки, так как недобросовестные действия могут включать сговор, подлог, умышленный пропуск, искаженное представление информации или действия в обход действующей системы внутреннего контроля;

получаем понимание внутренних контролей, значимых для аудита, с целью разработки аудиторских процедур, соответствующих обстоятельствам, но не с целью выражения мнения об эффективности системы внутреннего контроля НКФО;

оцениваем надлежащий характер применяемой учетной политики и обоснованность бухгалтерских оценок и соответствующего раскрытия информации, подготовленного руководством;

делаем вывод о правомерности применения руководством допущения о непрерывности деятельности, а на основании полученных аудиторских доказательств – вывод о наличии существенной неопределенности в связи с событиями или условиями, в результате которых могут возникнуть значительные сомнения в способности НКФО непрерывно продолжать деятельность. Если мы приходим к выводу о наличии существенной неопределенности, мы должны в нашем аудиторском заключении привлечь внимание к соответствующему раскрытию информации в финансовой отчетности или в случае ненадлежащего раскрытия модифицировать мнение. Наши выводы основываются на аудиторских доказательствах, полученных до даты аудиторского заключения. Однако будущие события или условия могут привести к утрате НКФО способности непрерывно продолжать деятельность;

проводим оценку представления финансовой отчетности в целом, ее структуры и содержания, включая раскрытие информации, а также обеспечения достоверности представления лежащих в ее основе операций и событий.

Мы информируем лиц, отвечающих за корпоративное управление, о запланированном объеме и сроках аудита, а также о существенных проблемах, выявленных в ходе аудита, в том числе о значительных недостатках системы внутреннего контроля.

Мы также предоставляем лицам, отвечающим за корпоративное управление, заявлениео соблюдении нами всех применимых этических требований в отношении аудиторской независимости и информируем их обо всех вопросах, которые можно обоснованно считать влияющими на независимость аудитора, а в необходимых случаях – о принятых мерах предосторожности.

Из числа вопросов, о которых мы проинформировали лиц, отвечающих за корпоративное управление, мы определяем наиболее значимые для аудита финансовой отчетности за отчетный период – ключевые вопросы аудита, включенные в настоящее заключение.

28 июня 2019 года, Минск.

Генеральный директор Иностранного унитарного аудиторского предприятия «Делойт и Туш» О. И. Степанеева

Квалификационный аттестат аудитора № 0001765 от 12 ноября 2009 года, выданный Министерством финансов Республики Беларусь. Свидетельство № 65 о соответствии квалификационным требованиям для осуществления аудиторской деятельности в банковской системе от 14 декабря 2011 года.

Заместитель начальника по аудиту и консалтингу предприятий финансовой и информационной отраслей Иностранного унитарного аудиторского предприятия «Делойт и Туш» М. М. Бабицкая

Квалификационный аттестат аудитора № 0001775 от 22 декабря 2009 года, выданный Министерством финансов Республики Беларусь

Свидетельство № 51 о соответствии квалификационным требованиям для осуществления аудиторской деятельности в банковской системе от 23 октября 2010 года

ООО «Центр Белинвентаризация»
г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1

- ✓ Раздел и установление порядка пользования земельным участком
- ✓ Раздел и вычленение изолированных помещений из капитального строения
- ✓ Пересчет долей в связи с изменением капитального строения

Извещает о проведении аукциона по продаже имущества ОАО «Гомельский радиозавод», тел. 8 (0232) 21 60 07

№ лота	Наименование объекта	Начальная цена продажи лота, руб. с НДС	Сумма задатка, руб.
1	Станок горизонтально-расточной 2А622Ф4-1 с инв. № 1871, находящийся по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Объездная, 9	**23 000,00**	**4 600,00**

Срок и место подачи заявления	**По 2 сентября 2019 г**. в рабочие дни с 9.00 до 16.00 от даты опубликования настоящего извещения по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1
Дата, время и место проведения аукциона	**4 сентября 2019 г. в 10.00** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1
Номер р/с для перечисления задатка	BY71 BPSB 3012 1783 3901 0933 0000 в РД № 300 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 491323266. Получатель платежа: ООО «Центр Белинвентаризация». Назначение платежа: задаток на участие в аукционе согласно извещению в газете «Звязда» от 01.08.2019 г.
Условия продажи	Объекты продаются в собственность. Шаг аукционных торгов 5 %, заключить договор купли-продажи в течение 20 календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона, оплатить стоимость объекта согласно договору купли-продажи. Победитель возмещает затраты на организацию и проведение аукциона

Дополнительная информация на сайте www.bti-gomel.by, по тел.: (0232) 75 06 62, (029) 341 15 45

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

по продаже земельного участка в частную собственность

Организатор электронных торгов: Свислочский сельский исполнительный комитет, Минский обл., Пуховичский р-н, г. п. Свислочь, ул. Набережная, 11, тел.: (801713) 2 42 77, 2 42 78.
Оператор электронной торговой площадки: открытое акционерное общество «Белорусская универсальная товарная биржа»
Электронный адрес электронной торговой площадки: www.et.butb.by
Дата проведения электронных торгов: **11 сентября 2019**
Время проведения электронных торгов устанавливается ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа» на электронной торговой площадке «БУТБ-Имущество»

№ п/п	Адрес земельного участка, кадастровый номер	Площадь земельного участка (га)	Наличие инженерных сетей	Расходы по подготовке документации (рублей)	Начальная цена (рублей)	Задаток (рублей)
1	г. п. Свислочь, ул. Широкая У-14 624455900001001033 (имеется древесно-кустарниковая растительность)	0,10	Газоснабжение, электроснабжение и водоснабжение	1504,33 + публикация в СМИ	9360,00	936,00

Задаток для участия в электронных торгах перечисляется на текущий (расчетный) счет № BY60AKBB30120000066940000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код AKBBBY2X, УНП 190542056, получатель платежа – ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа». **Срок внесения задатка** – до подачи заявления на участие в электронных торгах. **Назначение платежа:** внесение суммы задатка на участие в торгах. **Окончание приема заявлений на участие в электронных торгах** с прилагаемыми к ним документами – **5 сентября 2019 года, до 15:00.**

Лицо, желающее принять участие в электронных торгах в отношении нескольких предметов электронных торгов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из этих предметов. Оплата стоимости предметов торгов осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. Осмотр земельных участков на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время либо с участием представителя организатора в рабочее время (понедельник-пятница, 8.00–13.00,14.00–17.00).

Электронные торги проводятся в порядке, установленном Положением о порядке проведения электронных торгов по продаже государственного имущества, включая земельные участки, права заключения договора аренды государственного имущества, в том числе земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 608 и Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа» от 29.12.2015 № 143.

Участник, ставший победителем аукциона, после окончания аукциона обязан: подписать протокол аукциона в день проведения аукциона; в течение 10 рабочих дней внести плату за земельный участок и возместить затраты на организацию и проведение аукциона; в течение двух месяцев со дня утверждения протокола о результатах аукциона обратиться в Марьиногорское бюро республиканского унитарного предприятия «Минское областное агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» за государственной регистрацией земельного участка, прав, ограничений (обременений) прав на него; получить в установленном порядке техническую документацию и разрешение на строительство жилого дома; занять (освоить) земельный участок не позднее одного года после получения утвержденной проектной документации на строительство жилого дома.

Затраты на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к земельным участкам для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов **подлежат возмещению** в порядке, предусмотренном в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 7 февраля 2006 г. № 72 «О мерах по государственному регулированию отношений при размещении и организации строительства жилых домов, объектов инженерной, транспортной и социальной инфраструктуры»

Белыя старонкі гісторыі

МАЛАВЯДОМЫЯ АРХІВЫ МІКАЛАЯ РАМАНАВА

дапамаглі настаўніцы з Магілёва знайсці ўнікальную інфармацыю пра дарэвалюцыйныя пахаванні

У пачатку XX стагоддзя вядомы вучоны, выдавец і гісторык вялікі князь Мікалай Міхайлавіч Раманаў (дзядзька цара Мікалая II) выдаў корпус звестак аб асобах, пахаваных на могілках Масквы, Пецярбурга, паўночных губерняў Расіі, а таксама Парыжа і яго ваколіц пад назвай «Рускі некропаль». У яго планах было сістэматызаваць інфармацыю і па ўсіх тых правінцыяльных могілках, якія знаходзіліся на тэрыторыі сённяшняй Беларусі — на той момант часткі Расійскай імперыі. У 1908—1911 гадах Магілёўская епархія правяла маштабную работу па перапісе даных з надмагільных пліт. Перад царкоўнымі служыцелямі таксама стаяла задача ўнесці ў спісы тых людзей, якія нешта зрабілі для горада або павета. Гэты абагульнены звод павінен быў увайсці ў адзін з тамоў спецыяльнага выдання. Але адбылася Кастрычніцкая рэвалюцыя, і сабраныя пра некропаль звесткі ляглі ў архівы. Нядаўна яны трапілі ў рукі магілёўскай настаўніцы гісторыі, завуча 34-й школы Галіны БЯЛЯЕВАЙ.

Тайна магілёўскага некропаля

Яшчэ шэсць гадоў таму яна разам з вучнямі занялася інвентарным вопісам магілёўскіх пахаванняў XIX — пачатку XX стагоддзя. У Магілёве яны ёсць на некалькіх могілках, але іх стан, мякка кажучы, не надта добры — разламаныя помнікі, напалову сцёртыя надпісы, урослыя ў зямлю пліты. Магчыма, нашчадкаў памерлых ужо таксама няма ў жывых або яны з'ехалі кудысьці на край свету, і хтосьці ўжо з іх унукаў шукае свае карані і не можа знайсці. Хутчэй за ўсё — і не знойдзе, бо спробы стварыць такую грунтоўную базу беларускіх могілак за апошняе стагоддзе болей не рабіліся. Ва ўсялякім разе, абагульненай базы Галіна Бяляева ў 2013 годзе не знайшла. Таму і вырашыла разам са сваімі вучнямі выправіць гэты прабел. За паўгода яны абышлі шэсць могілак — Успенскія, Машэкаўскія, Яўрэйскія, Польскія, Карабанаўскія, Васкрасенскія — і ўнеслі ў спіс 292 магілы. Усе пахаванні класіфікаваны па часе, палавой і ўзроставай прыналежнасці, зроблена ацэнка захаванасці помнікаў, складзены спісы імянных надмагілляў, пазначаны і тыя пахаванні, якія ідэнтыфікаваць не атрымалася. Але калі даследчыкі паспрабавалі дапоўніць спіс інфармацыяй з мясцовых архіваў, высветлілася, што там нічога па гэтай тэме няма.

— Наш пошук зацягнуўся на пяць доўгіх гадоў, — кажа Галіна Бяляева. — Мы знаходзілі новыя помнікі, папаўнялі свой спіс, але ўвесь час хацелася даведацца, што было зроблена да нас.

Аднойчы яна знайшла ў інтэрнэце падказку — спасылку на менавіта той самы архіў князя Мікалая Раманава. Ледзь дачакалася летняга адпачынку, каб адправіцца ў Расію і нарэшце дакрануцца да архіўных старонак.

— Калі ехала, я дакладна ведала і фонды, і вопісы, і колькі ўсяго старонак складае гэты архіў. Калі адкрыла вялікі архіўны фаліянт, сэрца аж закалацілася ад невымоўнай радасці. Мяне перапаўнялі пачуцці — архіў Мікалая Міхайлавіча Раманава з вопісам некропаля, які быў зроблены Магілёўскай кансісторыяй за 1908 — 1911 гады, нарэшце ў маіх руках.

180 старонак — за тры дні

«Помнікі здымаюцца з месцаў, прадаюцца гандлярам: надпісы, крыжы, скульптурныя выявы знікаюць або абязвечваюцца; пліты закладаюцца ў падмуркі, тратуары, пад вадасцёкавыя трубы, разбіваюцца на бут. Цэлыя склепы з засыпанымі тынкоўкай і пылам стагоддзяў помнікамі, з сарванымі гербамі, з замазанай фарбай ці знішчанымі надпісамі служаць складам нягодных рэчаў», — пісаў у сваёй прадмове да першага тома «Маскоўскага некропаля» Мікалай Раманаў. За апошняе стагоддзе з паверхні зямлі знікла яшчэ больш культавых будынкаў, помнікаў, магіл... Знікла бясследна, разам з цікавымі надпісамі, сімваламі, знакамі.

— Пра былую сінагогу на Вялікай Мяшчанскай вуліцы (сёння Грамадзянская) мы ўсе добра ведаем, а што было ў ёй унутры — пытанне, — інтрыгуе Галіна Бяляева. — У архіве знайшлася інфармацыя пра надпіс, які быў на яе сцяне. «Чалавек тужыць пра страту капіталу свайго і не тужыць пра страту дзён сваіх. А дні яго незваротныя». Сапраўды, мы заўсёды перажываем за матэрыяльнае і зусім не думаем пра тое, што час нашага знаходжання на зямлі абмежаваны. Калі сядзіш і ўдыхаеш пах дакументаў стогадовай даўніны, гэтыя словы гучаць асабліва пранарочку.

На сёння па Магілёўскай епархіі захавалася 180 старонак архіўнага матэрыялу. Магілёў, Чэрыкаўскі, Клімавіцкі, Чавускі, Мсціслаўскі і іншыя паветы, а яшчэ — Орша, Аршанскі павет, Рагачоўскі, нават Гомель — яны таксама ўваходзілі ў Магілёўскую епархію. Галіна Бяляева паспела закансперктаваць усе тыя імёны, якія былі там пазначаны. За тры дні спісала два нататніка, сядзела ў архіве з раніцы да позняга вечара, пакуль працавала ўстанова. У гасцініцы ўсё перачытвала і наступны дзень пачынала з таго, што перагортвала тыя ж самыя старонкі, каб яшчэ раз зверыць літары і словы, якія выклікалі сумненў.

— Царкоўныя служачыя працавалі над гэтым зводам цэлыя тры гады, у сваіх лістах адзначалі, што рабоце часта перашкаджалі снег або дрэнная захаванасць надпісаў, — кажа настаўніца. — Але нават не ўсё тое, што яны сабралі, трапіла ў зводны спіс Магілёўскай кансісторыі. Часцей за ўсё гэта адбывалася з прычыны дрэннага почырку. Я перагледзела ўсе архівы, знайшла прапушчаныя імёны і перапісвала іх, а таксама імёны тых святароў, якія гэтыя спісы складалі.

Месца цяпер вядома

Суразмоўніца прыводзіць прыклады таго, якія адкрыцці дапамагла здзейсніць здабытая ёй інфармацыя. У сярэдзіне мінулага стагоддзя ў Магілёве быў знесены Богаяўленскі Брацкі манастыр, які знаходзіўся ў раёне сучаснай плошчы Славы. Архіўны спіс дапамог даведацца, што на манастырскіх могілках знаходзілася пахаванне генерала кавалерыі Сямёна Васілевіча Каханава — героя руска-турэцкай вайны. У царкоўнай агароджы гэтага ж манастыра быў пахаваны адзін з магілёўскіх губернатараў — Мікалай Скалон, а ў самой царкве яго дачка Алена. Гэта была яго трэцяя дачка, пра якую ніхто не ведаў — усе лічылі, што ў яго два дзіцяці. Там жа пахавана Пелагея Пятроўна Карабанькава — прадстаўніца вядомага шляхецкага роду. А можа, гэта ў яе гонар у Магілёве існуе мясцовы тапонім Карабанаўка? Для Магілёўскай епархіі цікавай аказалася інфармацыя пра тое, што на тамтэйшых могілках знайшоў свой вечны спачын архімандрыт Афанасій, які ў розны час быў настаяцелем гэтага манастыра і Успенскага, што ў Пустынках Мсціслаўскага раёна. Месца яго пахавання дагэтуль было невядома. Адкрыццём стала і тое, што ў Пустынках пахаваны настаяцель Успенскага манастыра архімандрыт Анатоль, які 30 гадоў працаваў на яго карысць і памёр у 1901 годзе. Там жа каля царквы была магіла яшчэ аднаго з настаяцеляў манастыра — ігумена Еляўферыя, які памёр у 1896 годзе.

— Спадзяюся, што ўсе тыя прозвішчы, якія я запісала, стануць разгадкай той ці іншай гістарычнай падзеі. Гэта важна не толькі для свяшчэннікаў і гісторыкаў, але і для звычайных людзей, якія ствараюць радаводы або захоўваюць пра кагосьці памяць, — лічыць Галіна Бяляева.

Троіцкая царква ў Магілёве наогул доўгі час была толькі прадметам здагадак. Нядаўна атрымалася знайсці яе падмурак. А Галіна даведалася яшчэ і пра двух святароў, якія былі пахаваныя каля яе.

— На жаль, протаіерэй, які занатоўваў гэтыя імёны, пісаў неразборліва, — кажа яна. — Калі ліст прыйшоў у Магілёўскую кансісторыю, яго нават вырашылі не ўносіць у спісы. Я знайшла яго сярод арыгіналаў.

У Слаўгарадзе (былым Прапойску) ведаюць пра князёў Крапоткіных. Але дзе яны пахаваны, было вядома толькі па расказах. Цяпер гэтае месца дакладна ўстаноўлена — каля храма Раства Прасвятой Багародзіцы.

— Захаваліся звесткі, што каля царквы знаходзяцца два мармуровыя помнікі з крыжамі наверсе. Адзін належаў князю Мікалаю Крапотніку, другі — яго жонцы Марыі Аляксандраўне, народжанай фон Бенкендорф.

Праца ў архіве дапамагла Галіне даведацца крыху болей не толькі пра іншых, але і пра свайго сваяка — калежскага саветніка Івана Паўлавіча Булая, які памёр у 1883 годзе. Яго пахаванне знаходзілася на Машэкаўскіх могілках.



Гісторыя аднаго клада

Саборныя могілкі (або, як іх яшчэ называлі, Кафедральныя) знаходзіліся якраз паміж цяперашнім гандлёвым цэнтрам «Панарама» і гасцініцай «Магілёў». Пахаванні знеслі ў 1960-я гады ў сувязі з перапланіроўкай горада. Перад тым як пусціць магілы пад бульдозер, ніхто нават не падумаў спісаць імёны з помнікаў. У 2013 годзе Галіна Бяляева з вучнямі паспрабавала выправіць несправядлівасць. На сайце школы, дзе, дарэчы, яны выставілі спісы па ўсіх магілёўскіх могілках, быў размешчаны заклік з просьбай падзяліцца інфармацыяй пра тых, хто пахаваны на Саборных могілках. Адгукнуліся толькі дзве сям'і — яны далі інфармацыю і фотаздымкі аб пяці сваіх родных.

— У архіве знайшлося яшчэ 20 прозвішчаў, — радуецца Галіна. — Гэта святары, ваенныя, выкладчыкі духоўнай семінарыі. Цікавасць уяўляе персона Мацвея Васілевіча Фурсава — рэдактара «Губернскіх ведамасцяў», дырэктара Магілёўскай гімназіі, праваслаўнага стацкага саветніка і аўтара гістарычнага нарыса да «Вопыту апісання Магілёўскай губерні» Аляксандра Дэмбавецкага. Тут жа быў пахаваны кіраўнік Магілёўскай кантрольнай палаты, правадзейны стацкі саветнік Мікалай Дзярагін. Гэтае прозвішча ёсць нават у памятных кніжках Магілёўскай губерні.

Замест любага — толькі яго мундзір

У архіве захавалася кранальная гісторыя, звязаная з Пугляеўскай царквой Горацкага павета. Там знаходзіўся помнік удзельніку паходу супраць Напалеона генерал-маёру Аляксею Пятровічу Мелісіну. Як сведчыў надпіс, генерал нарадзіўся ў 1766 годзе, а ў 1788-м уступіў у шлюб з дачкой князя Кантакузена. Забіты быў у 1813 годзе падчас бітвы пры Дрэздэне. Яго цела пахавалі ў Цепліцы (тэрыторыя сучаснай Чэхіі), а жонцы, якая спрабавала знайсці яго парэшткі і перавезці ў Расію, перадалі толькі мундзір, у якім быў забіты яе сужэнец. І гэты мундзір быў пахаваны ў Пугляеўскай царкве. Уся гэта гісторыя стала магільнай эпітафіяй.

Цяпер настаўніца дапаўняе той спіс магілёўскага некропаля, які пачынала складаць разам са сваімі вучнямі. На жаль, ён таксама будзе няпоўны. Тыя, хто займаўся перапісам надмагілляў у пачатку 1900-х, не вельмі адказна паставіліся да сваёй місіі, і іх спісы атрымаліся сціплыя. Але гэтая інфармацыя ўсё роўна каштоўная і робіць шмат новых адкрыццяў. Галіна Бяляева спадзяецца, што, магчыма, нарэшце атрымаецца выправіць гістарычную несправядлівасць і зрабіць тое, што, на жаль, не атрымалася ў вялікага князя Мікалая Раманава, — выдаць гэтыя спісы асобным томам.

Нэлі ЗІГУЛЯ,
фота аўтара і з архіва.

«НЕСАПРАЎДНЫЯ» ГРОШЫ

Як засцерагчыся ад фальшывак?

Нягледзячы на тое што ў краіне поўным ходам укараняюцца безнаяўныя плацяжы, фальшываманецтва адыходзіць у гісторыю не жадае. Артыкул 221 Крымінальнага кодэкса прадугледжвае даволі строгае пакаранне за самавольны выраб, захоўванне або наўмысны збыт такіх грошай. За гэта можна адправіцца ў не вельмі аддаленыя месцы на тэрмін да сямі гадоў. Калі ж фальшываманецтва паўторнае або здзейснена групай зламыснікаў, то санкцыя ўзмацняецца да 15 гадоў. І ўсё роўна знаходзяцца людзі, якія друкуюць грошы на прынтарах, а пасля ідуць з імі ў краму.

— Пластыкавыя карткі ўсё-такі дапамаглі зменшыць колькасць фактаў падробленых грошай. Напрыклад, у 2006 годзе супрацоўнікі аддзелаў па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі выкрылі 2800 такіх фактаў. А ўжо летась іх было каля 800. За першае паўгоддзе гэтага года несапраўдныя грошы намагаліся збыць 320 разоў. Прыкладна два разы на дзень, — заўважае **старшы оперупаўнаважаны па асабліва важных справах ГУБЭЗ МУС Дзмітрый ЛАГУН.** — Сваю лепту ў паляпшэнне сітуацыі ўносіць і паступовае ўдасканаленне ступеняў абароны грошай. Над гэтым мы пастаянна працуем сумесна з Нацыянальным банкам. Ды і мы ўвесь час нагадваем пра асноўныя прыкметы падробленых грошай, якія можна распазнаць нават без спецыяльных дэтэктараў: адсутнасці рэльефнасці, абарончых ніцяў, мікратэксту.

— Але якая валюта часцей за ўсё падрабляецца ў нашай краіне?

— Тут трэба размежаваць два паняцці. Што да фактаў збыту, то пераважная большасць прыпадае на даўно звыклую нам трыяду замежных валют — долараў ЗША, еўра і расійскіх рублёў. У долараў — сумная пальма першынства. Падробленыя амерыканскія грошы выяўляліся за першае паўгоддзе 135 разоў. Наміналы, як правіла, буйныя — 100 і 50, радзей 20 долараў. «Адзінкі», «двойкі», «пяцёркі» і «дзясяткі» падрабляюцца рэдка. Для злачынцы выгадней атрымаць максімальны прыбытак пры мінімуме высілкаў, таму стадоларавая купюра будзе для яго больш прывабнай, чым аднадоларавая. Да таго ж гістарычна склалася, што буйныя наміналы часцей за ўсё адпраўляюцца ў доўгатэрміновыя «схроны», калі чалавек па нейкіх прычынах не адкрывае ўклад у банку. Але калі ўзяць факты вырабу, то фальшывыя купюры з партрэтамі заакіянскіх прэзідэнтаў сходзяць з друкарскіх станкоў па-за межамі нашай краіны.

Тое ж самае датычыцца еўра. Падробка такіх грошай вымагае значных рэсурсаў і пастаяннага ўдасканалення тэхналогій. З расійскімі рублямі сітуацыя крыху іншая — іх, як правіла, падрабляюць унутры самой Расіі. Сляды раз-пораз вядуць у рэспублікі Паўночнага Каўказа... Дарэчы, фальшывыя разліковыя білеты Цэнтрабанка сёлета выяўляліся 101 раз. Як і ў выпадку з доларамі, гэта буйны намінал — 1000 і 5000 рублёў. Як правіла, купюры такой вартасці прывозяць у Беларусь, вяртаючыся з заробкаў.

Агульны намінал падробак, здадзеных за раз, вельмі рэдка перавышае 200 долараў.

На трэцім месцы ў злачынным рэйтынгу — еўра. На долю падробак купюр Еўрацэнтрабанка прыпадае 19 працэнтаў. Часцей за ўсё гэта 50, 100, 200 і 500 еўра. Апошні намінал тым больш цікавы, што ў еўразоне яшчэ летась быў спынены выпуск новых 500-еўравых купюр. Колькасць тых, што знаходзяцца ў абарачэнні дагэтуль, імкліва скарачаецца. Звязана гэта з тым, што банкноты гэтага наміналу пасля пападання ў банк, у тым ліку і шляхам інкасацыі з гандлёвых пунктаў, назад ужо не вернуцца. Ну а рэшту выдаць самым буйным наміналам, натуральна, немагчыма. Таму сапраўдныя 500-еўравыя купюры зусім хутка стануць рарытэтам.

Але гэтая купюра, відавочна, у фаворы ў замежных фальшываманетчыкаў. Літаральна зусім нядаўна ў Беларусі было выяўлена некалькі такіх несапраўдных банкнотаў. Двое грамадзян Казахстана прыехалі ў Беларусь з вялікай сумай грошай. Частку яны адклалі на гульню ў казіно, частку — на набыццё аўтамабіля. Мэты цалкам законныя, а вось 500-еўравыя купюры, з якімі яны пайшлі ў банк, аказаліся падробленымі.

— А калі ўзяць менш распаўсюджаныя валюты — фунты, франкі, кроны?

— На долю такіх падробак даводзіцца не больш за паўтара працэнта, — працягвае суразмоўца. — Яно і зразумела: калі гістарычна склалася, што сродак накаплення наяўных грошай у замежнай валюце — гэта долар і радзей еўра, то каму патрэбны, напрыклад, чэшскія кроны, брытанскія фунты стэрлінгаў або швейцарскія франкі? Іх далёка не ў кожным банку здасі. А так падчас абмену валюты сёлета тройчы выяўляліся «левыя» кітайскія юані. Па адным факце даводзіцца на долю ўкраінскіх грыўняў і фунтаў стэрлінгаў.

Цікава ведаць

Ды і як сродак накаплення грошай малараспаўсюджаныя валюты даволі рызыкоўныя. Напрыклад, Вялікабрытанія ў гэтым дзесяцігоддзі мяняла банкноты вартасцю 20 і 50 фунтаў. Час на прыём старых грашовых знакаў быў даволі абмежаваны (усяго некалькі месяцаў), ну а надалей іх можна было здаць толькі непасрэдна ў Банк Англіі. Інакш гэтыя грошы ператвараліся проста ў прыгожыя паперкі, якія, магчыма, калі-небудзь зацікавяць прыватных калекцыянераў.

— Але такая сітуацыя можа быць з кожным. Скажам, чалавек ездзіў у тую ж Вялікабрытанію, дзе нешта набываў. І калі яму нядобрасумленны прадавец даў у якасці рэшты фальшывую купюру, то адкуль жа ён будзе ведаць ступені абароны фунта стэрлінгаў? Ён іх, можа, першы раз і ў руках трымае. Ці вось узяць нядаўні выпадак у Гродне. На вяселле людзям падарылі, як гэта водзіцца, грошы. Навяспечаны муж панёс 100-доларавую купюру ў абменнік, а яна аказалася падробленай.

— Падчас кваліфікацыі фальшываманецтва пад увагу бярэцца намер асобы. Калі чалавек усведамляе, што нясе падроблены банкнот, то за гэта адказнасць надыходзіць. А калі вы, скажам, знайшлі ў кніжнай шафе «заначку» ад старэйшага пакалення, сярод якой аказалася адна фальшывая купюра, то ў ход уступае тэрмін «добрасумленны збытчык». Гэта значыць, што вы не займаліся падробкай грошай і не ведалі пра тое, што купюры несапраўдныя. У нас быў выпадак, калі чалавек прынёс у банк здаваць 30 тысяч долараў наяўнымі, якія засталіся ў спадчыну ад памерлага бацькі, а адна з банкнот аказалася «намаляванай». Але па факце збыту ўсё роўна была заведзена крымінальная справа, а добрасумленны збытчык праходзіў у якасці сведкі. Самае галоўнае, што патрабуецца ў гэтым выпадку, — расказаць усё як ёсць праваахоўным органам. Магчыма, менавіта дзякуючы вашым сведчанням будзе зразумелы ланцужок руху падробленай купюры.

Прычым варта зазначыць, што падробкі бываюць не толькі поўныя, але і частковыя. Напрыклад, у нас быў выпадак, калі зламыснік прыклеіў да пяцідоларавай купюры раздрукаваны нулік і панёс здаваць навяспечаны банкнот у 50 долараў у банк. Намінал лёгкім рухам рукі быў павялічаны ў дзесяць разоў, а заадно ён зарабіў сабе тэрмін у месцах адбыцця пакарання.

— А наколькі часта падрабляюцца беларускія рублі?

— Працэнт такіх фальшывак нязначны і складае ад трох да пяці. Гэта датычыцца як часу да дэнамінацыі, так і цяперашняй сітуацыі. Ды і самі «падпольныя» беларускія рублі вельмі няякасныя. Так званых суперпадробак, як гэта бывае з замежнай валютай, вырабленай на высокапрафесійным абсталяванні, мы не сустракалі. Звычайна зламыснікі выкарыстоўваюць просты бытавы прынтар. Падрабляюцца самыя хадавыя купюры наміналам 10, 20 і 50 рублёў. Псіхалогія зламысніка простая: як мага хутчэй збыць купюру ў месцы, дзе яе не будуць спачатку вельмі пільна правяраць, і атрымаць у якасці рэшты сапраўдныя грошы. Купюры наміналам 100, 200 і тым больш 500 рублёў у нас на дадзеным этапе вельмі рэдкія і адразу прыцягнуць дадатковую ўвагу прадаўцоў ці кіроўцаў у транспарце.

У пачатку 2017 года ў Мінску былі зарэгістраваны факты збыту няўсталяванымі асобамі падробленых купюр наміналам 20 рублёў. Іх знаходзілі падчас пералічвання выручкі ў кіёсках «Мінсктранса», у крамах, маршрутных таксі. Адну фальшыўку прынёс нават пенсіянер, які прадаваў сваю гародніну на рынку. Было заведзена ажно 25 крымінальных спраў. Супрацоўнікі Галоўнага ўпраўлення па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі ГУУС Мінгарвыканкама высветлілі дзвюх асоб, якія займаліся вырабам і збытам фальшывых рублёў. Суд Фрунзенскага раёна Мінска прыгаварыў іх да вялікіх тэрмінаў: аднаго злачынца да сямі гадоў і аднаго месяца ў калоніі ўзмоцненага рэжыму з канфіскацыяй маёмасці, другога — да чатырох гадоў такога ж рэжыму, яго маёмасць таксама была канфіскавана.

— А ці можа касір у абменніку «прапусціць» фальшывую валюту, якая потым трапіць у банк?

— Сістэма абароны ад гэтага ў банку шматузроўневая. Валюту яшчэ будзе чакаць некалькі праверак. Ды і ў самога касіра стаіць спецыяльны апарат, які дазваляе адразу праверыць, ці сапраўдную купюру працягнулі яму ў акенца.

Пры гэтым цікава, што агульны намінал падробак, здадзеных за раз, вельмі рэдка перавышае 200 долараў.

— Калі згадаць «Старога Хатабыча», то там апісана сцэна, як чараўнік стварыў сто тысяч долараў з адным і тым жа нумарам...

— Такія купюры выяўляюцца рэгулярна. Тут ўся справа ў тэхналагічным працэсе. Паколькі падробка долараў і еўра пастаўлена замежнымі групоўкамі ледзь не на прамысловы ўзровень, то яны выкарыстоўваюць адно і тое ж клішэ, каб паскорыць працэс. Зусім як у тыпаграфіі. І з такім клішэ друкуецца шмат падробленых купюр. Яны пасля ўкідваюцца ў абарачэнне ў розных месцах. Але колькасць банкнотаў у такой партыі, вядома, вялікая. Дзве купюры з аднолькавымі нумарамі могуць спакойна апынуцца на тэрыторыі адной краіны. І нават больш за тое — нам вядомы выпадак, калі яны адначасова аказаліся ў кашальку аднаго і таго ж чалавека.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

Сорак восем малодшых лейтэнантаў міліцыі

Заступілі ў апошні дзень ліпеня на свае пасты ў сталічнай міліцыі.

Ім уручылі табельную зброю і службовыя пасведчанні.

— Сёння для вас урачысты дзень, — адзначыў **начальнік ГУУС Мінгарвыканкама Іван КУБРАКОЎ.** — Вы ўліваецеся ў падраздзяленні сталічнай міліцыі. Хачу сказаць колькі слоў пра вашу будучую службу. Нагрузка тут самая высокая ў краіне. У нас праходзіць шмат масавых мерапрыемстваў, у тым ліку і спартыўных. Тыя супрацоўнікі, якія прайшлі гэтую школу, могуць працаваць паўсюль. Пераважна з іх і камплектуецца цэнтральны апарат МУС.

Месца для ўрачыстага рытуалу было выбрана сімвалічнае — каля помніка міліцыянерам, якія загінулі ў мірны час пры выкананні службовых абавязкаў.

— Ён тут праводзіцца ўпершыню, — зазначыў Іван Кубракоў. — У гэтым месцы знаходзіцца помнік нашым калегам, якія навек засталіся ў страі. Мы шануем памяць пра іх. І новыя супрацоўнікі мусяць выхоўвацца на гэтых ідэалах. Што да службовай падрыхтоўкі, то яна ўдасканальваецца год ад году. Нашы супрацоўнікі, якія маюць вялікі досвед практычнай работы, выязджаюць у навучальныя ўстановы, дзе праводзяць заняткі.

Слабы пол выбірае моцныя прафесіі

Чым вабіць дзяўчат суровая міліцэйская рамантыка?

Святочныя канфеці, запушчаны ў неба пагон з паветраных шароў, падкінутыя па традыцыі ўгору манеткі ў спадзяванні на бліскучую кар'еру — для 118 выпускнікоў Магілёўскага інстытута МУС, якія развіталіся сёлета са сваёй альма-матар і папоўнілі міліцэйскія падраздзяленні краіны, выпускны дзень запомніцца назаўсёды.

Адметным стала тое, што сярод выпускнікоў было як ніколі шмат дзяўчат. Нараўне з хлопцамі лейтэнанцкія пагоны атрымалі 24 прадстаўніцы слабага полу. Як жа цудоўна яны выглядалі, калі з неверагоднай грацыёзнасцю крочылі па пляцы! Замест міліцэйскіх фуражак — стыльныя капялюшыкі, на нагах туфлі-лодачкі, элегантны кіцель па фігуры з пышным аксельбантам — што там казаць, прыгажуням вельмі пасуе парадная форма. Але ж гэта, напэўна, не самая галоўная з прычын, па якіх яны выбралі сіловое ведамства. Дарэчы, чатыры дзяўчыны — Аліна Грабко, Ангеліна Казлова, Аліна Сцяблова і Ірына Танюк — атрымалі дыпломы з адзнакай, а дзве з іх яшчэ і залатыя медалі. І гэта вельмі высокі вынік.



Магілёўская ВНУ лічыцца адной з наймацнейшых кузняў міліцэйскіх кадраў. Тут ідзе падрыхтоўка спецыялістаў юрыдычнага кірунку, прызваных абараняць інтарэсы грамадскасці. А ў гэтым не павінна быць фармалізму, таму курсанты не абмяжоўваюцца вывучэннем юрыдычных правілаў і законаў, яны ўвесь час у творчасці. З першага ж года навучання іх прыцягваюць да даследчай і навуковай дзейнасці. Як вынік — высокія адзнакі і перамогі ў розных конкурсах.

Аліна Грабко летась стала другой ў рэспубліканскім конкурсе аратарскага майстэрства «Цыцэроній-2018». Шмат у чым ёй тут дапамог начальнік кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін кандыдат філалагічных навук Сяргей Венідыктаў. На конкурсе дзяўчына закранула праблемы сляпых людзей і выступіла больш чым пераканаўча. Спадзявалася на першае месца, але і другое не так ужо кепска — перахвалявалася крышачку. Яшчэ адзін дыплом Аліна атрымала на конкурсе ў БДЭУ пад назвай «Дзяржава, права, асоба». Там яна казала пра тое, які важны і адказны ўплыў аказвае на дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, прыёмная сям'я. Дарэчы, маці Аліны працуе выхавацелем дзіцячага дома сямейнага тыпу і ў дзяўчыны па гэтай тэме быў свой асабісты досвед. Суразмоўца прызнаецца, што займацца навуковай дзейнасцю ёй вельмі прыемна і яна ўдзячная за гэта сваёй выкладчыцы — загадчыцы кафедры прававых дысцыплін Ірыне Дэмідавай, якая аднойчы звярнула ўвагу на дапытлівую курсантку і запрасіла яе на міжнародны круглы стол. Дзяўчына адчула цікавасць да даследчай работы, яна падымала такія сур'ёзныя праблемы, як эмацыйнае выгаранне супрацоўнікаў міліцыі, экстрэмізм у маладзёжным асяроддзі. Яе напрацоўкі друкаваліся ў навуковых зборніках і часопісах.

Лёс яшчэ адной выпускніцы інстытута Вольгі Шумянцавай быў вызначаны яшчэ ў школе. Вучаніца лёгка трапляла з пнеўматычнага ружжа ў яблычак. У інстытуце яе навыкі ацанілі і паднялі на яшчэ больш высокі ўзровень. Падчас вучобы яна здала нарматыў майстра спорту па стральбе з табельнага пісталета і з гонарам прадстаўляла свой інстытут на прэстыжных конкурсах. Летась на чэмпіянаце МУС яна з лёгкасцю выбіла 90 ачкоў са ста. Такім вынікам могуць пазайздросціць нават хлопцы.

Для Валеры і Івана Пражэвальскіх інстытут наогул стаў месцам стварэння сям'і. Яны пасябравалі на першым курсе, а летась сталі мужам і жонкай. Сужэнцы будуць служыць у Кастрычніцкім РАУС Віцебска — ён аперупаўнаважаным, яна — участковым інспектарам.

— Хлопцаў у нашым інстытуце шмат, але заўсёды марыш пра чалавека вернага і надзейнага, — усміхаецца дзяўчына. — Першыя паўгода ў інстытуце ты яшчэ не разумееш, дзе знаходзішся, умовы жыцця зусім не падобныя на тыя, што былі раней. Чагосьці баішся, перажываеш. І Іван мне шмат у чым дапамагаў, пастаянна былі адно ў аднаго на ўвазе, маглі нешта абмеркаваць — нам разам вельмі лёгка.

Але, як прызнаецца дзяўчына, інстытут яна выбрала зусім не таму, што тут вучыцца так шмат хлопцаў. Яна яшчэ ў старэйшых класах марыла стаць юрыстам, праўда, не звязвала гэта з нейкай асобнай ВНУ. Толькі пасля таго як у школе пра інстытут расказалі супрацоўнікі міліцыі, яна мэтанакіравана падала дакументы ў гэтую ўстанову. Дарэчы, у сям'і ніхто раней не працаваў у міліцыі. Але Леры па душы яе прафесія. Напэўна, таму, што яна па характары больш баявая. Наогул, усе дзяўчаты з яе курса паступалі асэнсавана, ехалі ў Магілёў з розных куточкаў краіны. Нехта загарэўся, наглядзеўшыся фільмаў пра прыгоды той жа Каменскай, хтосьці вырашыў працягнуць дынастыю, а некаторыя, як Лера, вызначыліся пасля прафарыентацыі. Лера прызнаецца, што канчатковыя ўяўленні пра прафесію склаліся толькі падчас вучобы і практыкі. Мары гэта адно, а служба — зусім іншае. Выпрабаванні пачаліся з першага ж года, калі вучыліся жыць па рэжыме на казарменным становішчы. Для дзяўчат тэрмін выпрабавання абмяжоўваецца годам. Лера не хавае: было цяжка, але гэта толькі загартавала яе. І яна не расчаравалася.

— Пасля вучобы мы павінны пяць гадоў адпрацаваць па прафесіі, і без любові да яе гэта вельмі цяжка было б зрабіць, — кажа Лера.

У залатой медалістцы Ангеліны Казловай свой шлях у прафесію. Пра службу ў міліцыі марыла яшчэ яе маці, але жаданне так і засталося нерэалізаваным: родныя яе ў гэтым не падтрымалі. Затое калі дачка вырашыла прысвяціць сябе міліцыі, маці з гатоўнасцю дала «дабро». Напэўна, мара перадалася дзяўчыне на генным узроўні. З другога курса Ангеліна ў навуковай дзейнасці, пераможца рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў. За гэтыя дасягненні яна як адораная студэнтка была адзначана стыпендыяй спецыяльнага Прэзідэнцкага фонду. А сёлета прадстаўляла інстытут на рэспубліканскім бале выпускнікоў з удзелам кіраўніка краіны.

Разумніцы, прыгажуні, спартсменкі — і гэта зусім не камплімenты для выпускніц інстытута, а чыстая праўда.

— Баявы характар і лідарскія якасці значаць шмат, але няўжо колькасць дзяўчат пры паступленні ў міліцэйскую ВНУ не абмяжоўваецца? — пацікавілася я ў намесніка начальніка Магілёўскага інстытута МУС па ідэалагічнай рабоце і кадравым забеспячэнні Дзмітрыя Панаждаева.

— Сапраўды, наш інстытут апошнім часам карыстаецца вялікай папулярнасцю ў жаночага полу, але стаць курсанткай не так проста, — кажа ён. — Трэба вельмі пастарацца, каб вытрымаць конкурс, а ён у нас заўсёды вялікі. Вось і сёлета на 15 месцаў, якія прадугледжаны для дзяўчат, прэтэндавала 75 саіскальніц. Прадстаўніцам слабага полу цяпер да смаку моцныя прафесіі.

Нэлі ЗІГУЛЯ.
Фота з архіваў Магілёўскага інстытута МУС.

Бяспека

«Чатыры маці дазвалялі гвалтаваць сваіх дзяцей»

30 ліпеня ў Беларусі пачалася інфармацыйная кампанія, скіраваная на прадухіленне сексуальнага гвалту і эксплуатацыі дзяцей. Яе дэвіз — «Навучыце дзіця бачыць падман». Цяпер злачынствы супраць палавой недатыкальнасці паступова перацякаюць у інтэрнэт-сферу. І пад маскай незнаёмага віртуальнага суразмоўцы можа хавацца хто заўгодна.

— У гэтым годзе выяўлены 353 дзіцяці, якія пацярпелі ад сексуальнага гвалту. Гэта прыкладна на 20 чалавек больш, чым за аналагічны перыяд летась, — адзначыў **намеснік начальніка Галоўнага ўпраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі крымінальнай міліцыі МУС Дзмітрый ЦАЮН.**

Што будзе ўключаць у сябе інфармацыйная кампанія? Перш за ўсё — прафілактычныя мерапрыемствы, скіраваныя на недапушчэнне фактаў гандлю людзьмі, інфармаванне грамадскасці з дапамогай як СМІ, так і прадстаўнікоў няўрадавых арганізацый. Рыхтуюцца буклеты, здымаюцца тэматычныя ролікі. Праваахоўнікі ж маніторацъ разнастайныя рэсурсы ў сеціве, каб выявіць педафілаў.

— Што датычыцца злачынстваў супраць палавой недатыкальнасці, якія здзяйсняюцца ў адносінах да дзяцей, то ў першую чаргу работа павінна праводзіцца з бацькамі, установамі адукацыі, дзе непасрэдна ажыццяўляецца кантакт з дзіцем і дзе яно праводзіць асноўную частку свайго дня, — мяркуе Дзмітрый Цаюн. — Адпаведна, мы павінны арыентаваць бацькоў і педагогаў на магчымыя факты выяўлення дзяцей, якія знаходзяцца ў групе рызыкі ці ўжо, на жаль, пацярпелі ад такіх злачынстваў.

Як чакаецца, у найбліжэйшы час запусцяць сайт, дзе будзе змешчаны шырокі аб'ём інфармацыі па гэтай праблематыцы. Ён структураваны датычна аўдыторыі. Матэрыяламі змогуць карыстацца дзеці розных узростаў, бацькі, педагогі і проста неабыякавыя грамадзяне.

— Перад супрацоўнікамі органаў унутраных спраў стаіць першачарговая задача не гнацца за колькаснымі паказчыкамі, а максімальна прафесійна і аператыўна спрацаваць, каб выявіць як мага больш пацярпелых, прадухіліць здзекі з дзяцей і выяўляць тых асоб, якія здзяйсняюць такія злачынствы, — зазначыў Дзмітрый Цаюн. — Педафілія, як правіла, латэнтная. І ад прафесіяналізму нашых супрацоўнікаў залежыць, наколькі хутка мы зможам устанавіць такіх людзей і прыцягнуць да адказнасці. У асноўным усе педафілы сядзяць у інтэрнэце. Каб пазбегнуць адказнасці, яны не паказваюць сваю сапраўдную знешнасць, род заняткаў, знаёмяцца з дзецьмі і пасля здзяйсняюць грумінгавыя злачынствы. Гэта спакушэнне праз інтэрнэт, сексуальныя намёкі... Мы прапрацоўваем змены ў заканадаўстве, каб крыміналізаваць гэтыя дзеянні. Хочам увесці прафілактычны артыкул у Крымінальны кодэкс.

Дзмітрый Цаюн асобна адзначыў, што каля 85 працэнтаў апытаных на сайце ведамства падтрымліваюць ініцыятыву аб увядзенні крымінальнай адказнасці за грумінгавыя злачынствы, а таксама за захоўванне дома дзіцячай парнаграфіі.

Але часта на такія злачынствы ідуць самыя блізкія людзі. Па звестках МУС, з 2013 года чатыром маці прад'явілі абвінавачванне ў злачынствах супраць палавой недатыкальнасці. Яны за грошы дазвалялі гвалтаваць сваіх дзяцей і здымаць гэта на відэа. Часта такія злачынствы здзяйсняюць самыя блізкія людзі — дзядулі, бацькі і сужыцелі маці.

Нядаўна вось здарыўся гучны выпадак у Наваполацку. Тры гады жыхар Мінска гвалтаваў маленькіх дзяўчынак, здымаў працэс на камеру і прадаваў відэа на тэматычныя сайты. Маці гэтых дзяўчынак — родныя сёстры. Яны мала таго што ведалі пра гвалт, дык яшчэ і дапамагалі злачынцу ў яго чорнай справе. А ў якасці платы атрымлівалі ежу і грошы.

— Непасрэдны ўдзел у згвалтаванні дзяцей прымаў адзін замежнік. Ён таксама замаўляў парнаграфічныя ролікі. Па нашай ініцыятыве ён затрыманы. Цяпер рыхтуецца яго экстрадыцыя ў Беларусь.

Кіраўнік прадстаўніцтва Міжнароднай арганізацыі па міграцыі ў Беларусі Зейнал Гаджыеў высока ацаніў намаганні Беларусі ў гэтай сферы.

— Вельмі складана адсачыць такія злачынствы, тым больш знайсці трафікёраў. Гэтыя акалічнасці вымагаюць пастаяннага абнаўлення падыходаў у рабоце. Мэта нашай кампаніі — інфармаванне дарослых і дзяцей пра гэтую праблему.

Прафілактычная кампанія праводзіцца Міністэрствам унутраных спраў сумесна з Міжнароднай арганізацыяй па міграцыі ў партнёрстве з ЮНІСЕФ па праекце міжнароднай тэхнічнай дапамогі «Умацаванне ў Рэспубліцы Беларусь нацыянальнага механізму перанакіравання пацярпелых ад гандлю людзьмі» пры фінансавай падтрымцы МЗС Каралеўства Нарвегія, USAID і ўрада Рэспублікі Польшча (Польская дапамога). Тэматычныя мерапрыемствы, прымеркаваныя да Сусветнага дня барацьбы з гандлем людзьмі, арганізаваны таксама пры падтрымцы МЗС Беларусі і прыватных кампаній.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

ХТО ВЫШЭЙШЫ РОСТАМ?

БДУ ўмацоўвае пазіцыі

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт падняўся на 416 пазіцый у рэйтынгу WRWU і заняў 703-е месца.

Абнаўленне звестак Webometrics Ranking of World Universities адбылося 29 ліпеня. Згодна з імі, БДУ ўваходзіць у дзясятку найлепшых універсітэтаў краін СНД, апярэджвае шэраг еўрапейскіх універсітэтаў, у тым ліку Вільнюскі (у яго 779-я пазіцыя) і Латвійскі ўніверсітэты (1166).

Сярод беларускіх ВНУ Белдзяржуніверсітэт традыцыйна лідзіруе. Другое месца займае Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт — у яго 2661-я пазіцыя, трэці радок у Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы (3373). У тройку найлепшых ВНУ свету ўваходзяць Гарвардскі ўніверсітэт, Стэнфардскі ўніверсітэт і Масачусецкі тэхналагічны інстытут. Вебаметрычны рэйтынг складаецца незалежнай іспанскай даследчай лабараторыяй Laboratorio de Internet і абнаўляецца двойчы на год.

У БДУ адзначаюць, што распрацоўшчыкі WRWU рэгулярна змяняюць крытэрыі і методыку ацэньвання. У выніку адбываецца непрадказальнае і рэзкае змяненне месцаў, якія займаюць універсітэты. Так, у бягучай версіі рэйтынга Google замянілі на камерцыйную сістэму Ahrefs.com. А ў папярэдняй рэдакцыі аўтары адмовіліся ўлічваць публікацыі буйных міжнародных калабарацый навукоўцаў, што істотна адбілася на пазіцыях многіх універсітэтаў.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 15 августа 2019 года проводит повторный 2 А открытый аукцион по продаже имущества

Номера лотов	Наименование имущества	Год выпуска	Начальная цена торгов, бел. руб., (с НДС)	Сумма задатка, бел. руб.
1	Автомобиль ГАЗ-2705-435, инв. № 60062	2004	2 162,52	216,25
2	Автомобиль УАЗ-3909, инв. № 60061	2004	1 952,87	195,29
3	Автомобиль ГАЗ-2705, инв. № 60102	2006	2 268,20	226,82

Место нахождения имущества: г. Минск, пер. Домашевский, 11.

Имущество, выставленное на аукцион, находится в республиканской собственности и хозяйственном ведении РУП «Белдорцентр».

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж, 15 августа 2019 г. в 11.30.

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток, внесшие гарантийный депозит и подавшие заявление на участие в аукционе, предоставившие свидетельство о государственной регистрации до 15.00 12 августа 2019 года.

Победитель аукциона обязан:

1. Заключить договор купли-продажи 15 августа 2019 г.

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 5 банковских дней, нерезиденты Республики Беларусь в течение 10 банковских дней со дня подписания договора купли-продажи.

3. Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем (единственным участником) по фактическим затратам не позднее следующего дня после их проведения.

4. РУП «Белспецконтракт» имеет право отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты проведения аукциона.

Задаток, указанный в таблице, а также гарантийный депозит в размере 300,00 белорусских рублей и денежные средства за выигранное имущество перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: белорусские рубли – р/с BY51BPSB30121078830299330000, российские рубли – р/с BY05BPSB30121078830876430000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-СберБанк», г. Минск, ул. Чкалова, 18, корп.1, код BPSBBY2X, УНП 101099370, ОКПО 37401662 Корреспондент-Сбербанк России, г. Москва, № корсчета 30111810100000000090. Реквизиты банка: БИК 044525225, ИНН 7707083893 к/с в ОПЕРУ Московского ГТУ Банка России №30101810400000000225, без НДС. Справки по тел./факс: (017) 398 05 41. Ранее опубликованное извещение в газете «Звязда» № 102 от 4.06.19

РУП «Торговый дом «Восточный» снимает с аукциона, который состоится 31.07.2019 **Лот № 16.** Капитальное строение с инвентарным номером 200/С-97391, общей площадью 92,1 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Гагарина, 11П. Назначение: здание специализированное для бытового обслуживания, наименование: прачечная. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 240100000001009879 площадью 0,0183 га. **Начальная цена продажи – 28 296,00 бел. руб., задаток — 2 829,60 бел. руб. Шаг аукциона — 5 %.** Извещение о проведении аукционных торгов было опубликовано 13.07.2019 в печатных средствах массовой информации – газета «Звязда» № 130.

УНП 101127633

О реализации предприятия как единого имущественного комплекса ОАО «Забашевичи»

ООО «Фрондера» извещает о проведении вторых повторных торгов в форме конкурса по продаже имущества ОАО «Забашевичи»

Организатор торгов	ООО «Фрондера» 220113, Республика Беларусь, г. Минск, улица Мележа, д. 1, офис 1121, тел. 8 (017) 392 70 10
Продавец	ОАО «Забашевичи» (222117, Минская обл., Борисовский р-н, Гливинский с/с, аг. Забашевичи, тел. +375 17 772 71 12) в лице управляющего – ООО «ПрофДМ» (220113, г. Минск, ул. Мележа, д. 1, оф. 1118-27 т. +375 (17) 395 89 17)
Форма, дата, место и время проведения торгов	Вторые повторные торги в форме конкурса **16.08.2019 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1121
Сведения о предмете торгов	**Лот № 1:** предприятие как единый имущественный комплекс «Пересады». Место нахождения Лота: 202135, Республика Беларусь, Минская обл., Борисовский район, Пересадский с/с, 6, северо-восточнее аг. Пересады
Начальная цена предмета торгов (без учета НДС)	**Лот № 1: 656 400,00 BYN** (шестьсот пятьдесят шесть тысяч четыреста белорусских рублей, 00 копеек) без НДС, согласно подп. 2.30.1 ст. 115 Налогового кодекса Республики Беларусь (Особенная часть) от 29.12.2009 N 71-З
Условия конкурса	- Сохранение назначения продаваемого объекта для целей производства с/х продукции
Размер, порядок и сроки внесения суммы задатка	Сумма задатка для участия в торгах – 1 % от начальной стоимости лота, что составляет 6 564,00 BYN (шесть тысяч пятьсот шестьдесят четыре белорусских рубля, 00 копеек). Сумма задатка в срок по **14.08.2019 (включительно)** вносится в бел. руб. на р/с BY36ALFA30122215570040270000 в Отделении «На Красной» ЗАО «Альфа-Банк», код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера». Назначение платежа: задаток для участия в конкурсе по продаже имущества ОАО «Забашевичи», проводимом 16.08.2019 г.
Сроки приема заявок на участие в торгах и прилагаемых к ним документов	Заявки на участие в торгах и прилагаемые док-ты принимаются в срок **до 18.00 14.08.2019** по адресу: 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1121. К заявке прилагаются: платежный док-т с отметкой банка о внесении задатка; копии док-тов, подтверждающих юр. полномочия участников торгов: для юр. лиц – копия свид-ва о гос. регистрации; доверенность, выданная представителю юр. лица (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель), для ИП – копия свид-ва о гос. регистрации ИП; для физ. лица – копия паспорта
Возмещение затрат на организацию и проведение торгов	Возмещение затрат на организацию и проведение конкурса производится победителем конкурса по фактическим затратам (расходы на проведение конкурса; расходы на проведение оценки имущества, выставленного на торги; вознаграждение аукционисту, расходы, связанные с регистрацией договора купли-продажи). Победитель торгов обязан перечислить на р/с продавца сумму фактических затрат в течение 5 дней со дня проведения конкурса
Порядок оформления участия в торгах	К участию в конкурсе допускаются лица, подавшие организатору торгов в установленный в настоящем извещении срок заявку (с приложением необходимых док-тов) и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении р/с сумму задатка, зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в торгах. В день проведения торгов перед их началом участники обязаны зарегистрироваться у организатора торгов, сдать запечатанные конверты с предложениями по цене предмета торгов и выполнению условий конкурса, получить конкурсные номера
Критерии выявления победителя конкурса	Победителем конкурса будет признан участник, предложивший, по мнению комиссии по проведению торгов, лучшие условия. В случае если предложения двух и более участников полностью соответствуют условиям конкурса и являются аналогичными по существу, победителем будет признан участник, предложивший наивысшую цену. В случае признания торгов несостоявшимися в связи с подачей заявки только одним участником или явки на торги одного из участников и при соответствии предложений претендента на покупку условиям конкурса производится продажа предмета конкурса этому претенденту на предложенных им условиях. При прочих равных условиях преимущественное право на приобретение указанного имущества принадлежит сельскохозяйственным организациям, расположенным в этой местности
Срок подписания и условия договора купли-продажи предмета торгов и оплаты	После предъявления копий док-тов, подтверждающих возмещение затрат, связанных с организацией и проведением торгов, между продавцом и победителем конкурса заключается договор купли-продажи предмета торгов. Договор купли-продажи предмета торгов должен быть подписан не позднее 30 календарных дней с момента подписания протокола о результатах конкурса. Оплата стоимости предприятия как имущественного комплекса победителем торгов в срок не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения торгов. Государственная регистрация договора купли-продажи и объектов недвижимости осуществляется Покупателем за свой счет
Дополнительная информация	По вопросу ознакомления с предметом торгов обращаться по тел.: +375 29 862 80 48 (Лекарев Василий Иванович). Дополнительная информация по предмету торгов, в том числе о составе предприятия как имущественного комплекса, по телефону +375 17 392 70 60, Анаида. Организация и проведение конкурса осуществляется на основании норм Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)», Указа Президента Республики Беларусь от 04.07.2016 № 253 «О мерах по финансовому оздоровлению сельскохозяйственных организаций», Указа Президента Республики Беларусь от 05.02.2013 № 63 «О некоторых вопросах правового регулирования процедур экономической несостоятельности (банкротства)»
Ранее опубликованные объявления	Журнал «Судебный вестник Плюс: экономическое правосудие». – 2019. – № 5. – С. 69, № 6. – С. 63–64; газета «Единство» – № 21 от 29.05.2019. – С. 22

Извещение о проведении повторного аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, офис 1703
Продавец	ОАО «БЕЛМЕТАЛЛ», г. Минск, пр-т Партизанский, 174

Предмет аукциона

Месторасположение **– Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское Шоссе, 18**

Наименование	Общая пл., кв. м	Инвентарный номер	Адрес (№ дома)
Лот № 1			
Открытый склад № 1	8916,3	110/С-62149	18В
Составные части и принадлежности: одно бетонное, одно плиточное покрытие, один железнодорожный подъездной путь, забор, двое ворот			
Торговые павильоны	345,8	110/С-100114	18В/4
Магазин автозапчастей	98,8	110/С-86092	18В/1
Составные части и принадлежности: метал. пристройка			
Туалет	28,6	110/С-99800	18В/2
Пост охраны	7,7	110/С-99750	18В/3
Имущество, входящее в состав лота: забор авторынка (металлич.) (инв. № 9061), кран мостовой (инв. № 4155), передвижные киоски (инв. № 1000020, 1000021, 1000022), шлагбаум Ditec (инв. № 9059), шлагбаум электромеханический ХВАЯ 01079 (инв. № 9169)			
Сведения о земельных участках: пл. **2,4570** га и **0,0137** га, предоставлены продавцу для обслуживания зданий и сооружений авторынка на праве постоянного пользования			
Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 776 475,50 бел. руб. (снижена на 20 %)			
Лот № 2			
Цех услуг	649,6	110/С-86090	18Г
Составные части и принадлежности: забор, покрытие			
Туалет	1,5	110/С-99715	18Г/1
Имущество, входящее в состав лота: вентилятор (инв. № 4792), кран подвесной (инв. № 4170), стеллаж для ЦМИ (инв. № 0000180)			
Сведения о земельном участке: пл. **0,4034** га, предоставлен продавцу для обслуживания здания цеха металлоизделий на праве постоянного пользования			
Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 147 174,06 бел. руб. (снижена на 20 %)			
Обременения: площади здания частично сданы в аренду. Здания находятся в залоге у банка. Более подробную информацию можно узнать у организатора аукциона			
Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, г. Минск, ул. Коллекторная, 11 БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа: ЗАО «Центр промышленной оценки»			
Срок подписания договора купли-продажи	**20** рабочих дней после проведения аукциона		
Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by			
Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 31.05.2019			
Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия			
Аукцион состоится 15.08.2019 в 11.30 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и необходимые **документы принимаются по 13.08.2019 до 17.00** по указанному адресу. Тел.: +375 (17) 280-36-37; 8 (029) 317-95-42. www.cpo.by. E-mail: auction@cpo.by			

Извещение о проведении повторного аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	ОАО «СПЕЦРЕМОНТ», 220036, г. Минск, Бетонный проезд, 13

Предмет аукциона

Недвижимое имущество, реализуемое одним лотом, по адресу: г. Минск, пр-д Бетонный, д. 11

Наименование (назначение)	Общая площадь	Инв. номер
Литер А 1-2/к, административное здание (здание неустановленного назначения).	546 кв м	500/С-5100
Склад (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения)	105,8 кв м	500/С-65842

В состав лота входит иное имущество. С перечнем имущества, входящего в состав предмета аукциона, можно ознакомиться на сайте организатора аукциона WWW.CPO.BY

Сведения о земельном участке: предоставлен на праве постоянного пользования общей площадью 0,3218 га для обслуживания здания неустановленного назначения, здания специализированного складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ

Начальная цена с НДС 20 %: 656 804,27 белорусского рубля BYN
Шаг аукциона: 32 840,21 белорусского рубля (BYN)

Порядок ознакомления: осуществляется в рабочие дни с 8.00 до 17.00. Ответственное лицо: Каминский Павел Иванович, 8029-659-14-39, Рудович Виктор Андреевич, 8 (029) 647-94-47

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней после проведения аукциона

Срок оплаты: не более 30 (тридцати) дней со дня заключения договора купли-продажи (если иное не предусмотрено договором купли-продажи

Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов: аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона www.cpo.by

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5 %

Затраты на организацию и проведение торгов возмещаются организатору аукциона участником торгов, с которым заключается договор купли-продажи в течение 5 дней со дня проведения торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» 28.06.2019 г.

Дата, место и время проведения аукциона	**15.08.2019** в 11.00 по адресу**: г. Минск, Бетонный проезд, 17, ОАО «СПЕЦРЕМОНТ».**
Дата, место и время окончания приема документов	**13.08.2019** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Контактные телефоны	+375 (17) 280-36-37; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by

Спытайце пра радзіннае

КАЛІ МОЖНА ЛАМАЦЬ ХЛЕБ?

«У дзяцінстве бацькі мяне вучылі ніколі не ламаць і не адкусваць хлеб, а вось сёлета была на пахаванні далёкага родзіча старэнькая-старэнькая бабуля ўзяла ў рукі бохан чорнага хлеба і пачала адломваць невялічкія кавалачкі і даваць кожнаму ў руку, каб з'елі. Ніхто не адмовіўся. Цікава, адкуль пайшоў такі звычай», — піша па электроннай пошце наша чытачка Наталля з Маларыцкага раёна.

Каб нашым сучаснікам было зразумела, чаму не варта ламаць ці адкусваць хлеб, раскрыем семантыку рытуальнага дзеяння «ламаць», якое ў народнай культуры заўсёды асацыявалася з разбурэннем, разрывам, дзяленнем на часткі і з'яўлялася адным са спосабаў знішчэння ці збаўлення ад чаго-небудзь. Таксама яно ўспрымалася як «магічны сродак абароны або навядзення псоты». У рытуальных бясчынствах, выкліканых парушэннямі ў кантэксце рэгламентаваных паводзін, дзеянне «ламаць» (руйнаваць, знішчаць, парушаць цэласнасць) выступала адным з галоўных элементаў. Напрыклад калі хтосьці з аднавяскоўцаў гарадзіў плот у «неналежны» час, напрыклад да Дабравешчання або Радаўніцы, і тым самым «турбаваў» зямлю раней дазволенага часу (пакуль першы гром не грымне, першы дождж не пройдзе), якая магла адгукнуцца неўраджаем, выкліканым засухай ці замаразкамі, аднавяскоўцы ў той жа дзень руйнавалі, ламалі, разбіралі яго.

Яшчэ адзін прыклад: калі хтосьці з аднавяскоўцаў забываў у полі барану, дзяўчаты павінны былі разламаць яе на дробныя кавалкі, у адваротным выпадку, лічылася, на працягу года ніводная з дзяўчат гэтага сяла не выйдзе замуж.

У сваю чаргу разламаныя прадметы заўсёды былі прадвесцем бяды. Так, хлеб, які трэснуў у печы, прадказваў смерць кагосьці з дамачадцаў: «Калі хлеб у печы разваліцца на дзве палавіны — гэта не на дабро».

Часцей за ўсё такія дзеянні, як ламаць, ірваць, руйнаваць, прысутнічалі ў пахавальным абрадзе. На Беларусі быў распаўсюджаны звычай разрываць ручнікі, на якіх труну з памерлым апускалі ў магілу (гэтымі кавалкамі абрадавай тканіны можна было лячыць некаторыя цяжкія хваробы, асабліва захворванні суставаў); знішчалі, ірвалі, спальвалі, разбівалі, у тым ліку ламалі, прадметы, з якімі памерлы быў у непасрэдным кантакце ў апошнія хвіліны жыцця (пасцельныя прыналежнасці, грэбень, люстэрка і да т. п.), знішчалі і тыя прылады, якія ўступалі ў непасрэдны кантакт з памерлым (мыла, прасціна і іншае).

Разломліванне, раздзіранне, спальванне ці любога роду знішчэнне як рытуальнае дзеянне выкарыстоўвалі ў абрадах вяснова-летняга цыкла, напрыклад, спальваючы або разрываючы, а затым раскідваючы па полі пудзіла Масленіцы або Зімы.

У шлюбнай сімволіцы і вясельных абрадах разбівалі посуд, г. зн. ламалі, сімвалізуючы разбурэнне, знішчэнне ранейшага, дашлюбнага статусу жаніха і нявесты. Той жа сімволікай прасякнуты ўсе рытуальныя дзеянні пасля першай шлюбнай ночы. Калі нявеста была цнатлівая, у абрадах удзельнічалі «цэлыя» прадметы (талерка, лыжка, блінец, кашуля і да т. п.), калі не — надарваныя, вышчарбленыя, трэснутыя, дзіравыя. У некаторых рэгіёнах перад першай шлюбнай ноччу ці пасля яе жаніх ці сват павінны былі разарваць, г. зн. рукамі разламаць вараную курыцу, што лічылася пацвярджэннем цнатлівасці нявесты.

Хлеб ламаць, а не рэзаць можна было толькі абрадавы (напрыклад, памінальны, што і рабіла згаданая вамі бабуля). Выключэнне тут складае вясельны каравай, які рэзалі нажом і рабіць гэта мог толькі мужчына — часцей за ўсё хросны бацька жаніха або нявесты.

У паўсядзённым жыцці ламаць хлеб катэгарычна забаранялася: забарона на пераламленне хлеба часта матываваная тым, што «хлеб мучыцца, калі яго ломяць» (укр. Палессе); «ломаты хлеб — грих велыкый» (Жытомірская вобласць); «будзіш ламаць, будуць чэрці лыка дзерці» (Бранская вобласць). Нярэдка лічылася, што хлеб ломяць толькі людзі, якія не баяцца Бога» (Палессе, Гомельшчына)».

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Дасылайце свае пытанні пра карані і прыстасаванасць да сучаснага жыцця каляндарных і сямейна-побытавых народных традыцый і абрадаў на паштовы або электронны адрас рэдакцыі з пазнакай «Пра радзіннае».

Чулі?!

Рэстаўрацыйныя работы Косаўскага палацава-паркавага ансамбля плануюць завяршыць у 2020 годзе.

З'ЯВІЦЦА ЗНАКАВЫ КУЛЬТУРНЫ КЛАСТАР

Фота БелТА

Аб гэтым, перадае **карэспандэнт БелТА, заявіў начальнік упраўлення культуры Брэсцкага аблвыканкама Сяргей ПАНАСЮК.**

«Ключавымі аб'ектамі гісторыка-культурнай спадчыны, на якіх вядуцца аднаўленчыя работы, на гэты момант з'яўляюцца Косаўскі палацава-паркавы ансамбль і палацавы комплекс Сапегаў у Ружанах, уключаныя ў дзяржаўную інвестыцыйную праграму, — сказаў начальнік упраўлення. — Рэстаўрацыя Косаўскага ансамбля пачалася ў 2008 годзе. Праведзена вялікая работа па захаванні гэтага аварыйнага аб'екта. Фінансаванне прадугледжвае Br5,1 млн. Плануецца стварэнне музейнай экспазіцыі, шматфункцыянальных памяшканняў для правядзення розных мерапрыемстваў. Завяршэнне работ на аб'екце запланавана на 2020 год». Сяргей Панасюк адзначыў, што не менш важным аб'ектам гісторыка-культурнай спадчыны з'яўляецца палацава-паркавы комплекс Сапегаў, дзе неабходна правесці рэстаўрацыю і кансервацыю аб'ектаў ансамбля. «Для стварэння знакавага для Беларусі турыстычнага кластара Косава-Ружаны неабходна стварэнне развітой інфраструктуры як транспартнай, так і абслуговай, а таксама зацікаўленасць турыстычных фірм для папулярызацыі новых паслуг», — падкрэсліў ён.

Пры рэалізацыі распараджэння Прэзідэнта Беларусі аб падрыхтоўцы да святкавання тысячагоддзя Брэста вядуцца работы па капітальным рамонце будынка археалагічнага музея «Бярэсце». «У жніўні 2019 года работы будуць завершаны ў поўным аб'ёме. У бягучым годзе будзе ўдзелена ўвага папаўненню музейнай калекцыі, удасканаленню экспазіцый, а таксама ўкараненню новых форм у культурна-асветныя і адукацыйныя работы», — дадаў начальнік упраўлення.

Акрамя таго, ён нагадаў, што ў кастрычніку 2019 года ў Брэсце пройдзе IV Нацыянальны форум «Музеі Беларусі», у час якога будуць прадэманстраваны дасягненні музеяў рэспублікі. Бібліятэчныя ўстановы Брэсцкай вобласці маюць станоўчую дынаміку развіцця якасці паслуг. Паўсюдна вядзецца работа па фарміраванні інфармацыйнага патэнцыялу рэгіёна. Бібліятэкі вобласці актыўна ўкараняюць інфармацыйныя тэхналогіі.

Паводле слоў Сяргея Панасюка, рэалізацыя дзяржпраграмы «Культура Беларусі» на 2016—2020 гады дае магчымасць развіваць культурны патэнцыял вобласці, «брэндавыя рэгіянальныя прадукты і паслугі, заснаваныя на мясцовых культурных традыцыях, паляпшаць тэхнічны стан і прывабнасць аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны, тым самым павялічваючы турыстычны патэнцыял краіны».

Гараскоп стрыжак на жнівень

1 жніўня, чацвер. Адзін з найлепшых перыядаў, калі варта наведваць цырульніка. Стрыжка можа палепшыць ваш знешні выгляд у цэлым і змяніць рытм жыцця.

2 жніўня, пятніца. Выдатны дзень для стрыжкі — яна атрымаецца не толькі раскошная, але і істотна падыме вашу самаацэнку, падорыць натхненне, прыцягне да вас захапленне і любоў навакольных.

3 жніўня, субота. Спрыяльны дзень для стрыжкі і афарбоўвання валасоў. Стрыжка паспрыяе набыткам і багаццю.

4 жніўня, нядзеля. Стрыжка сёння дазволіць захаваць здароўе і зберажэ ад негатыўнай энергетыкі. Прычоска павінна быць старанна прадумана, каб не разарваць сувязь з космасам.

5 жніўня, панядзелак. Стрыжка сёння дазволіць пазбавіцца ад дрэннага самаадчування. Лепш выбраць строгую прычоску: гэта дазволіць прыцягнуць станоўчую энергію.

6 жніўня, аўторак. Нейтральны дзень для стрыжкі валасоў — ледзь вышэй сярэдняга. Затое яны адрастаюць хутчэй, чым на Месяц, які ўбывае.

7 жніўня, серада. Варта ўстрымацца ад стрыжкі, бо валасы могуць пачаць жыць сваім жыццём — стаць непаслухмянымі і рэагаваць па-свойму на сродкі для ўкладкі.

8 жніўня, чацвер. Негарманічны дзень, стрыжка прывядзе да перамен, можа як палепшыць, так і пагоршыць ваша жыццё, адносіны з людзьмі.

9 жніўня, пятніца. Стрыжка валасоў сёння супрацьпаказаная. Яна можа дрэнна адбіцца на вашым псіхічным стане.

10 жніўня, субота. Нейтральны дзень для стрыжкі.

11 жніўня, нядзеля. Выдатная магчымасць зрабіць стрыжку і змяніць сваё жыццё да лепшага.

12 жніўня, панядзелак. Ад стрыжкі лепш устрымацца, а вось расчэсваць валасы варта як мага часцей, каб прыцягнуць станоўчую энергію.

13 жніўня, аўторак. Стрыжка можа справаказаваць выпадзенне валасоў, энергетычнае знясіленне. Аднак калі вы аматар рызыкі, паспрабуйце змяніць прычоску.

14 жніўня, серада. Паход да цырульніка лепш адкласці, бо стрыжка не будзе трымаць форму і, імаверна, вы не атрымаеце жаданага выніку.

15 жніўня, чацвер. Лепш устрымацца ад стрыжкі, бо магчымыя парушэнні псіхікі ў выніку стрыжкі, павышэнне ціску, галаўныя болі і з'яўленне розных фобій.

16 жніўня, пятніца. Дзень неспрыяльны для стрыжкі, затое ён выдатна падыходзіць для афарбоўвання.

17 жніўня, субота. Неспрыяльны дзень для стрыжкі і афарбоўвання валасоў, можна страціць станоўчую энергію, сутыкнуцца з фінансавымі праблемамі.

18 жніўня, нядзеля. У выніку стрыжкі з'явяцца перашкоды ў справах, узнікнуць хваробы. Па ўсходніх павер'ях, стрыжка ў гэты дзень прыцягне да вас злых духаў.

19 жніўня, панядзелак. Стрыгчыся і фарбавацца не варта, затое выдатны вынік дасць дамашняя лячэбная маска.

20 жніўня, аўторак. Нейтральны дзень для змены іміджу, аднак ад паходу да цырульніка лепш адмовіцца.

21 жніўня, серада. Стрыжка валасоў акажа станоўчы ўплыў на іх здароўе, надасць ім сілу і зменшыць выпадзенне. Прыдатны час для эксперыментаў з колерам.

22 жніўня, чацвер. Калі ў вас праблемы са здароўем, то стрыжка можа дапамагчы вылечыцца. Таксама стрыжка ў гэты дзень прыцягне грошы. Для прыцягнення энергіі лепш выбраць строгую, невысокую прычоску.

23 жніўня, пятніца. Абавязкова падстрыжыцеся або займіцеся валасамі. Кардынальнае афарбоўванне таксама да поспеху, ад нязначнай змены колеру валасоў лепш адмовіцца.

24 жніўня, субота. Калі ў вас на душы «камень», «скрабуць кошкі» або жудасна мучыць сумленне, то лепш пастрыгчыся менавіта ў суботу, тады разам з часткай валасоў вы зможаце пазбавіцца ад усяго сабранага ўнутры вас негатыву і адчуць сябе абноўленым чалавекам.

25 жніўня, нядзеля. Сёння варта наведваць салон толькі тым, хто збіраецца ў падарожжа: лёгкая карэкцыя колеру або даўжыні дапаможа прыбраць перашкоды са шляху і зробіць дарогу лягчэйшай.

26 жніўня, панядзелак. Вельмі дрэнны дзень для стрыжкі. Могуць узнікнуць праблемы са здароўем. Афарбоўванне можа справаказаваць канфлікты.

27 жніўня, аўторак. Неспрыяльны дзень для стрыжкі — яна дрэнна адаб'ецца на структуры валасоў.

28 жніўня, серада. Вельмі зручны час для стварэння прыгожых стрыжак і ўкладак. Афарбоўка добрая ў любыя натуральныя адценні.

29 жніўня, чацвер. Стрыжка сёння вельмі спрыяльная — яна падыме вам настрой і прыцягне пазітыўную энергію.

30 жніўня, пятніца. Калі рашыцеся на стрыжку менавіта сёння, майце на ўвазе, што гэта павінен быць крайні выпадак. А даўжыню астрыжаных валасоў трэба рабіць не большай за тры сантыметры.

31 жніўня, субота. Добры дзень — валасы будуць добра расці, умацуюцца і палепшаць сваю структуру, будуць менш секчыся. Прычоска будзе доўга захоўваць форму і прыгажосць.

АГУЛЬНАЯ ПАМЯЦЬ — І НІЯКІХ ЦЯЖКАСЦЯЎ ПЕРАКЛАДУ

У межах Дзён культуры Узбекістана ў Беларусі адбыўся круглы стол, прысвечаны літаратурным сувязям і наогул культурнаму супрацоўніцтву дзвюх краін. Арганізатарамі сустрэчы творчай і навуковай інтэлігенцыі выступілі Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы, Міністэрства інфармацыі Беларусі, пасольства Рэспублікі Узбекістан у Рэспубліцы Беларусь і Выдавецкі дом «Звязда».

...Яшчэ летась у Ташкенце адкрылі помнік класіку беларускай літаратуры Якубу Коласу і аднавілі вуліцу яго імя. А літаральна некалькі дзён таму ў адным са сквераў Мінска з'явіўся бюст вялікага ўзбекскага паэта, мысліцеля і дзяржаўнага дзеяча Алішэра Наваі. І гэта значна больш, чым проста дыпламатычна-культурныя рэверансы паміж дзвюма краінамі. Бо Узбекістан з Беларуссю звязваюць не толькі гады эвакуацыі, якія Якуб Колас з сям'ёй правёў у Ташкенце, але і баявыя подзвігі на франтах Вялікай Айчыннай. Больш як 500 чалавек толькі з Самаркандскай вобласці ўдзельнічалі ў абароне Брэстчыны, 32 ураджэнцы Узбекістана ў баях за вызваленне Беларусі былі ўдастоеныя звання Героя Савецкага Саюза; Узбекістан жа выратаваў ад голаду і смерці звыш 1,5 мільёна эвакуіраваных савецкіх грамадзян, у тым ліку каля 300 тысяч дзяцей-сірот з Беларусі, блакаднага Ленінграда, нават з Польшчы і Іспаніі. (Пры гэтым — унікальны факт! — у дзіцячыя дамы выстройваліся чэргі ахвотных усынавіць асірацелых дзяцей з іншых рэспублік і краін...)

Сучасны Узбекістан — краіна шматнацыянальная і вельмі талерантная. Мяркуйце самі: адукацыя тут вядзецца на сямі мовах, тэле- і радыёвяшчанне, друкаваныя СМІ выходзяць на 12 мовах, у краіне існуе 16 канфесій, і да ўсіх іх як на дзяржаўным, так і на побытавым узроўні ставяцца з аднолькавай павагай і прыязнасцю.

«Нашы краіны ўзаемадзейнічаюць вельмі даўно — яшчэ ў 20—30-я гады мінулага стагоддзя Беларусь, як і іншыя савецкія рэспублікі, дапамагала Узбекістану наладжваць прамысловасць і эканоміку, — нагадаў на круглым стале **старшыня камітэта па міжнацыянальных зносінах і сяброўскіх сувязях з замежнымі краінамі пры Кабінеце міністраў Рэспублікі Узбекістан Рустамбек КУРБАНАЎ.** — Другая магутная хваля міграцыі звязаная з Вялікай Айчыннай вайной і эвакуацыяй. Трэцяя ж — з будаўніцтвам Ташкенцкага трактарнага завода, дзе працавала мноства мінчан, спецыялістаў з МТЗ. І, вядома, Беларусь блізкая і родная для нас краіна яшчэ і таму, што многія нашы землякі склалі галовы ў баях за вызваленне агульнай савецкай Радзімы. Дзякуй вялікі ўсім беларусам за тое, што захоўваеце гэтую памяць». Ён таксама выказаў спадзяванне, што пасля візіту дэлегацыі ў Беларусь папоўніцца новымі кнігамі — падручнікамі па беларускай мове, зборнікамі паэзіі і прозы, перакладамі беларускіх пісьменнікаў — і бібліятэка, створаная пры камітэце па міжнацыянальных зносінах.

«Я ўпершыню прыехаў у Беларусь, убачыў вашу сталіцу і гэты цудоўны музей Янкі Купалы. І, шчыра прызнаюся, глыбока ўражаны той руплівасцю і ўвагай, з якой вы захоўваеце нашу агульную гісторыю, — зазначыў **рэктар Ташкенцкага дзяржаўнага ўніверсітэта ўзбекскай мовы і літаратуры імя Алішэра Наваі Шухрат СІРАДЖЫДДЗІНАЎ.** — Я адчуваю паміж нашымі народамі шмат агульнага: наш паэт Алішэр Наваі, як і беларускія паэты Янка Купала і Якуб Колас, выступаў за ўмацаванне нават у самых складаных умовах роднай мовы і культуры, захаванне нацыянальнай ідэнтычнасці...». Шухрат Сіраджыддзінаў расказаў, што цяпер пры ўніверсітэце працуе Цэнтр расійскай культуры, які ў прыватнасці займаецца перакладам узбекскіх класікаў і сучасных аўтараў на рускую мову, і наадварот, і выказаў спадзяванне, што неўзабаве з'явіцца аналагічны Цэнтр беларускай культуры, які дапаможа народам дзвюх краін праз узаемныя пераклады стаць бліжэй адзін да аднаго.

«Асабіста мне прыемна, што ініцыятывы, з якімі выступае наша аб'яднанне, амаль адразу знаходзяць водгук на дзяржаўным узроўні», — сказала **старшыня Ташкенцкага гарадскога беларускага нацыянальнага цэнтра «Світанак» Святлана ДУДЗЮК.** Так, у 2017 годзе адразу знайшла падтрымку ідэя ўстанаўлення ў Ташкенце мемарыяльнай дошкі і помніка Якубу Коласу, на чарзе — увекавечанне памяці беларускай паэткі Эдзі Агняцвет, якая таксама жыла ва Узбекістане ў эвакуацыі, і пераклад на ўзбекскую мову паэмы Якуба Коласа «Сымон-музыка», якой споўнілася ўжо больш чым 100 гадоў.

«Ужо больш за 60 гадоў няма з намі вялікага паэта, але сувязь з Узбекістанам захоўваецца, і гэта цудоўна, — падкрэсліла **намеснік дырэктара Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа Настасся ТРАФІМЧЫК.** — Хоць з Ташкентам звязаныя даволі трагічныя старонкі ў жыцці паэта, але ён захаваў надзвычай цёплыя ўспаміны пра сонечную краіну, якая выратавала жыццё ягонай сям'і і падарыла сяброўства з узбекскімі паэтамі, ён прысвяціў нямала вершаў Узбекістану і да канца сваіх дзён з цеплынёй і ўдзячнасцю згадваў праведзены там час. Таму вельмі важна, што і сёння працягваюцца ініцыятывы, звязаныя з перакладам твораў Якуба Коласа на ўзбекскую мову».

«Мы ва Узбекістане вельмі любім і шануем як Якуба Коласа, так і іншых беларускіх паэтаў і пісьменнікаў, з творчасцю якіх знаёмыя яшчэ са школы, — запэўніў **старшыня Саюза пісьменнікаў Узбекістана, народны паэт Сіраджыддзін САІДАЎ.** — Але адна рэч — ведаць адзін пра аднаго на адлегласці, а іншая — сустрэцца вочы ў вочы, абмеркаваць шляхі супрацоўніцтва і сумесныя планы. А я ўпэўнены, што іх будзе шмат, бо Мінск і Ташкент цяпер вельмі блізка: наш вялікі паэт Алішэр Наваі навечна «прапісаўся» ў Мінску».

Старшыня Акадэміі мастацтваў Узбекістана Акмал НУРЫДДЗІНАЎ і **кіраўнік Саюза мастакоў Беларусі Рыгор СІТНІЦА** ў працяг тэмы аднадушна пагадзіліся, што плённае супрацоўніцтва ў галіне літаратуры трэба пашыраць і на іншыя сферы культуры. «Я вельмі хацеў бы папрацаваць з вашымі мастакамі і паказаць ім не толькі сталіцу, але таксама іншыя рэгіёны Узбекістана, зрабіць сумесную выстаўку ў Ташкенце, а таксама прывезці творчую дэлегацыю ў Беларусь, бо нам ёсць чаму павучыцца — напрыклад, у галіне скульптуры, ліцейнай школы, якая ў вас цудоўна захавалася», — сказаў Акмал Нурыддзінаў.

Канкрэтныя прапановы па супрацоўніцтве прывёз на гістарычную радзіму і **прафесар кафедры рускай мовы і літаратуры Узбекскага дзяржаўнага ўніверсітэта сусветных моў Анатоль ЛІХАДЗІЕЎСКІ** (дарэчы, сын беларускага паэта і перакладчыка Сцяпана Ліхадзіеўскага, які значную частку жыцця правёў ва Узбекістане) — магчыма, неўзабаве дамову аб супрацоўніцтве ў галіне філалогіі падпішуць Узбекскі ўніверсітэт сусветных моў і Белдзяржуніверсітэт. Акрамя таго, Анатоль Сцяпанавіч прэзентаваў калегам свае распрацоўкі — спецкурс лекцый і семінараў «Літаратура славянскіх народаў», належнае месца ў якім займаюць беларускія паэты і пісьменнікі, і выказаў упэўненасць, што ў недалёкай будучыні гэты курс будзе пашыраны і дапоўнены імёнамі сучасных беларускіх літаратараў.

Падчас сустрэчы, натуральна, гучалі не толькі разважанні і практычныя прапановы аб супрацоўніцтве, але і вершы на розных мовах — узбекскай, рускай і беларускай — у выкананні паэта, публіцыста, тэлевядучага Навума Гальпяровіча, маладой узбекскай паэткі Малікі Абідавай, праўнучкі народнага паэта Беларусі Якуба Коласа і супрацоўніцы аднайменнага літаратурнага музея Васіліны Міцкевіч. Таксама на круглым стале прэзентавалі кнігу «Перамога адна на ўсіх. Беларусь—Узбекістан». Яна расказвае пра подзвігі ўзбекаў і беларусаў, якія змагаліся ў гады Вялікай Айчыннай вайны з нямецка-фашысцкімі захопнікамі на тэрыторыі Беларусі, і з'яўляецца часткай маштабнай кніжнай серыі «Беларусь памятае: у імя жыцця і міру».

«Звыш тысячы імёнаў ураджэнцаў Узбекістана, якія загінулі на тэрыторыі Беларусі ў 1941—1944 гадах, нам удалося ўстанавіць і ўнесці ў спіс памяці. Даследчая работа ў архівах, перапіска са сваякамі загінулых салдат працягваецца, некаторыя сакрэтныя матэрыялы цяпер раскрываюцца, таму, мяркую, спіс яшчэ будзе дапоўнены», — адзначыў **дырэктар выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» Уладзімір АНДРЫЕВІЧ.** Акрамя таго, рыхтуецца да выдання ў 2020 годзе сумесны праект Інстытутаў гісторыі Беларусі і Узбекістана, прысвечаны ўзбекам і ўраджэнцам Узбекістана, якія вызвалялі Беларусь і набліжалі агульную Перамогу.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.
Фота Канстанціна ДРОБАВА.



Сімвалы дружбы: у жніўні 2018 года ў Ташкенце ўрачыста адкрылі помнік беларускаму паэту Якубу Коласу, які знаходзіўся з сям'ёй ва Узбекістане ў гады Вялікай Айчыннай вайны, а сёлета адзін са сквераў Мінска ўпрыгожыў бюст-помнік геніяльнага паэта і гуманіста, заснавальніка ўзбекскай літаратуры Алішэра Наваі.

Фота БелТА.

Цёмнае мінулае

ДЭТЭКТАР ХЛУСНІ СЯРЭДНЯВЕЧЧА

Прабацька сучаснага дэтэктара хлусні быў вынайдзены яшчэ ў сярэднія вякі. Аднак работа сярэднявечнага «паліграфа» значна адрознівалася ад сучаснага.

У Рыме ёсць мястэчка, куды лгуны хадзілі без усякага задавальнення, бо там яны рызыкавалі застацца без рукі. Цяпер у порціку царквы святой Марыі крывавых сцэн не адбываецца,

але цікаўных каля Bocca della Verita больш чым дастаткова. Таму што там знаходзяцца так званыя «Вусны праўды» («Уста истины») — містычны дыск з выявай аблічча паганскага бажаства Эрколя Пераможцы (героя раманскай міфалогіі, своеасабліва ўспрынятага і перайначанага італійцамі Геракла). Круглая скульптура была створана, як мяркуецца, у IV стагоддзі да н. э. і да XVII стагоддзя служыла хутчэй прадметам дэкору. Як менавіта скульптура дыяметрам 1,75 метра здолела заняць месца ў царкве Санта-Марыя-ін-Касмедзін, на сённяшні дзень застаецца загадкай. Але менавіта ў сярэднявеччы забабонны люд свята верыў у тое, што за хлусню пагражае жорсткае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення рукі, якую неабходна ўкласці проста ўнутр містычнай мармуровай маскі.

Усякаму лгуну, які паклаў сваю руку ў адкрыты рот статуі, паводле падання, Эрколь яе адкусваў. Эрколь, не Эрколь, але з адваротнага боку скульптуры стаяў кат з сякерай, і чалавеку, прызнанаму судом вінаватым, тую руку адсякаў. Паблізу ад царквы і плошчы, на якой стаіць храм, знаходзіўся рынак. Сюды часта прыходзілі для разбору спрэчак. Паколькі забабоны былі моцныя сярод людзей, ілгуны прызнаваліся ў сваіх няправедных справах, нават не засоўваючы руку ў рот. Лепш прызнацца і застацца з рукой, чым паспрабаваць даказаць сваю сумленнасць і рызыкнуць канечнасцю, лічылі яны.

Шмат легенд і баек апавядаюць аб «Вуснах праўды».Часта мужы прыводзілі сюды сваіх жонак, каб яны прызналіся ў нявернасці. Аднойчы падазраваную ў здрадзе прывялі да «Вуснаў праўды» пры вялікім збегу народа. Перш чым яна паклала руку ў вусны, з натоўпу выбег мужчына і пацалаваў яе. І тады, уклаўшы кісць рукі ў шчыліну, маладая жанчына сказала: «Я ў сваім жыцці ведала толькі двух мужчын: свайго мужа і гэтага вар'ята, які толькі што мяне пацалаваў». Паколькі яна сказала праўду, яе рука засталася цэлая. Пасля гэтага выпадку ў Рыме сталі казаць, што ні адна жанчына не пабаіцца ўкласці руку ў «Вусны праўды», таму што можа знайсці выйсце з самага бязвыхаднага становішча.

Фотафакт

Першы гандлёвы аўтамат

Купля кансерваванай ежы ў першым гандлёвым аўтамаце. Лондан, 1925 год.

АДНА З ПРЫБЫТКОВЫХ ПРАФЕСІЙ МАЙЯ

Цывілізацыя майя поўная таямніц, але дзякуючы рабоце антраполагаў іх з кожным новым адкрыццём становіцца ўсё менш.

Напрыклад, даследчыкі з універсітэта штата Луізіяна нядаўна знайшлі прадмет, дзякуючы якому змаглі назваць адну з самых прыбытковых прафесій тых часоў. Яна прыносіла столькі багацця, што работнікі маглі сабе дазволіць інструмент, зроблены з каштоўнага каменя — нефрыту.

Камень нефрыт займаў вельмі важнае месца ў культуры цывілізацыі майя — з яго выраблялі ўпрыгажэнні для высокапастаўленых асоб, а таксама прадметы для правядзення рытуалаў. Аднак новае адкрыццё даказвае, што некаторыя людзі маглі дазволіць сабе рэч з нефрыту, прызначаную для даволі бруднай працы ў месцах па здабычы кухоннай солі.

Старажытны інструмент быў знойдзены на паўднёвай частцы краіны Беліз, што знаходзіцца ў Цэнтральнай Амерыцы і абмываецца Карыбскім морам. Паводле слоў даследчыкаў, на месцы знаходкі старажытнага артэфакта калісьці існаваў адзін са 110 старажытных участкаў, дзе народ майя здабываў соль. Гэтыя ўчасткі размяшчаліся на марскіх лагунах, акружаных вечназялёнымі ліставымі лясамі.

На вялікае шчасце антраполагаў, дзякуючы асаблівому складу сырой глебы і наяўнасці торфу інструмент з нефрыту выдатна захаваўся. Галоўная частка яго зроблена з рэдкай і дарагой разнавіднасці каменю пад назвай жадэіт, а ручка — з руковага дрэва Honduras rosewood. Даследчыкі лічаць, што прылада не прызначалася для ўзаемадзеяння з цвёрдым дрэвам і каменем, а выкарыстоўвалася, хутчэй за ўсё, для чысткі рыбы і мяса.

Тое, што здабытчыкі солі маглі сабе дазволіць такія інструменты, сведчыць, што яны былі паспяховымі прадпрымальнікамі. У гэтым няма нічога дзіўнага, таму што ў цывілізацыі майя соль не толькі актыўна выкарыстоўвалася ў гатоўцы ежы, але і лічылася прыкметай багацця.

Жывая прырода

Рака, якая цячэ два месяцы на год

Пра існаванне гэтай ракі ведаюць нямногія, тым больш што знаходзіцца яна ў Антарктыдзе — на мацерыку, дзе рэк, як лічылі доўгі час, проста не можа быць. Гэтая рака называецца Онікс. Нягледзячы на тое, што яе працягласць каля 30 кіламетраў, яна з'яўляецца самай доўгай ракой Лядовага кантынента.

І цячэ Онікс усяго два месяцы на год — увесь астатні час яна стаіць, прамерзлая да самага дна. Рака знаходзіцца на Зямлі Вікторыі, выцякае з возера Браўнуорт, а ўпадае ў іншае возера — Ванда. Па антарктычных мерках клімат тут дастаткова спрыяльны, летам бывае цёпла, што і дазваляе Оніксу на некаторы час вызваліцца ад ледзянога панцыра. Менавіта ў гэтым раёне 5 студзеня 1974 года была зарэгістраваная адна з самых высокіх тэмператур у Антарктыдзе — плюс 15 градусаў па Цэльсіі.

Прынята лічыць, што Антарктыда цалкам пакрыта снегам і лёдам. Гэта не так. Напрыклад, сухія далiны Мак-Мерда, дзе працякае Онікс, з'яўляюцца самай вялікай тэрыторыяй Антарктыды, дзе снегу практычна не бывае. Агульная плошча гэтых далін складае каля 8000 квадратных кіламетраў. Снег тут проста не затрымліваецца з прычыны таго, што над далінамі пастаянна дзьмуць моцныя вятры. Ніякай рыбы ў рацэ не водзіцца, толькі багавінне і мікраарганізмы. Узровень вады ў Оніксе схільны да вельмі значных ваганняў у залежнасці ад тэмпературы паветра і хуткасці растаяння леднікоў.

Але часам Онікс бывае досыць «паўнаводны». Напрыклад, у 1984 годзе па рацэ змаглі сплавіцца новазеландскія турысты-экстрэмалы. На беразе Онікса працавала палярная станцыя «Ванда», якая належыць Новай Зеландыі. Возера Ванда, у якое ўпадае Онікс, з'яўляецца гіперсалёным: утрыманне солі ў вадзе значна вышэйшае, чым нават у Мёртвым моры. Яно ўвесь год пакрыта тоўстым пластом лёду, толькі ў летні перыяд ён растае ўздоўж берагоў. Тут рыба таксама не водзіцца. Але возера знакаміта сваім «Караліўскім клубам плыўцоў возера Ванда». Той, хто рызыкне пагрузіцца ў адталыя воды возера, атрымлівае адпаведны знак. У лік членаў клуба ўваходзяць нават некаторыя вядомыя палітыкі.

У сухіх далінах Мак-Мерда знаходзіцца яшчэ адна славутасць Антарктыды — Крывавы вадаспад, які выцякае з ледніка Тэйлара. Вада, якая цячэ з невялікай лядовай расколіны, сапраўды мае колер крыві. Гэта тлумачыцца тым, што ў ёй утрымліваецца вялікая колькасць аксіду жалеза. Гэты незвычайны вадаспад быў знойдзены ў 1911 годзе геолагам з Аўстраліі Грыфітам Тэйларам.

Падрыхтаваў Іван КУПАРВАС.

Тэхналогіі

НЕ ПРЫШПІЛІЎСЯ — НЕ ПАЕДЗЕШ

Дарожна-транспартныя здарэнні па-ранейшаму з'яўляюцца асноўнай прычынай смерці падлеткаў у ЗША, таму кампанія Chevrolet пайшла на рашучыя меры і ўкараніла новую функцыю, якая не дазволіць аўтамабілю пачаць рух, пакуль кіроўца не прышпіліць рэмень бяспекі.

Не толькі ў нас кіроўцы і пасажыры не любяць прышпільвацца рамянямі бяспекі і прыдумляюць розныя спосабы абысці гэты абавязак, нягледзячы на хітрыкі вытворцаў аўтамабіляў. Паводле амерыканскай статыстыкі, з 37 133 чалавек, якія загінулі ў аварыях у 2017 годзе ў ЗША, 47 % не былі прышпілены рамянямі. Прычым самы нізкі працэнт выкарыстання рамянёў бяспекі — у падлеткаў.

Каб неяк выправіць сітуацыю, кампанія Chevrolet укараніла ў 2015 годзе сістэму Teen Driver, якая дазваляе бацькам кантраляваць выкарыстанне аўтамабіля дзецьмі. У меню бартавога камп'ютара ключ запальвання можна наладзіць такім чынам, каб пры яго распазнанні актываваўся запраграмаваны абмежавальнік хуткасці, усе сістэмы бяспекі пераводзіліся ў найбольш строгі рэжым і ў дадатак абмяжоўваўся гук аўдыёсістэмы.

Змена настроек, зразумела, абаронена PIN-кодам. Але цяпер у стандартнае абсталяванне красовера Traverse, седана Malibu і пікапа Colorado для амерыканскага рынку ўвойдзе і функцыя Buckle to Drive. Яна не дазволіць перавесці селектар каробкі перадач з «паркінга» ў «драйв», калі кіроўца не прышпілены. Пры гэтым ён пачуе гукавы сігнал і ўбачыць папярэджанне на панэлі прыбораў.

Бацькі таксама змогуць паглядзець ў бартавым камп'ютары пройдзеную адлегласць, максімальную хуткасць, папярэджанні аб яе перавышэнні і колькасць спрацоўванняў сістэм бяспекі, у тым ліку антыблакіровачнай сістэмы тармазоў. Chevrolet разам са Страхавым інстытутам дарожнай бяспекі ЗША (IIHS) правялі даследаванне, якое паказала, што дзякуючы гэтай функцыі падлеткі сталі прышпільвацца на 16 % часцей.

ИЗВЕЩЕНИЕ

о проведении **3 сентября 2019 года открытого аукциона** по продаже земельных участков в частную собственность и на право заключения договоров аренды земельных участков

Аукцион по продаже земельных участков в частную собственность

№ лота	1	2	3	4	5	6
Адрес земельного участка	**г. Речица, ул. Героев Бреста, 68**	**г. Речица, пер. Кирпичный, 3**	**Речицкий р-н, Борщевский с/с, д. Грановка, ул. Совхозная, 6А**	**Речицкий р-н, Глыбовский с/с, д. Милоград, ул. Садовая, 15А**	**Речицкий р-н, Глыбовский с/с, д. Береговая Слобода, 3**	**Речицкий р-н, Белоболотский с/с, д. Черное, ул. Октябрьская, 35**
Кадастровый номер	324550100001013456	324550100001013489	324581602601000120	324582403601000293	324582400601000118	324588605601000148
Категории земель	Земли населенных пунктов, садоводческих товариществ, дачных кооперативов					
Площадь, га	0,1003	0,0708	0,1500	0,1341	0,2024	0,2500
Целевое назначение земельного участка	Для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов (для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме))					
Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории	Возможность подключения водо-, газо-, электроснабжения, сети связи	Возможность подключения водо-, газо-, электроснабжения, сети связи	Возможность подключения электроснабжения	Возможность подключения водо-, газо-, электроснабжения, сети связи	Возможность подключения водо-, электроснабжения, сети связи	Возможность подключения электроснабжения, сети связи
Начальная цена земельного участка, руб.	6860,52	3603,72	2220,00	2342,99	1656,56	2750,00
Размер задатка, руб.	686,05	360,37	222,00	234,30	165,66	275,00
Ориентировочная сумма затрат на организацию и проведение аукциона, руб.	1791,30 +публикация в газетах	1681,76 +публикация в газетах	1760,73 +публикация в газетах	1656,72 +публикация в газетах	1772,04 +публикация в газетах	1643,77 +публикация в газетах
Условия аукциона	-	С правом вырубки древесно-кустарниковой растительности; с объектами, подлежащими сносу	С правом удаления древесно-кустарниковой растительности (насаждений)	-	С объектами, подлежащими сносу	С правом вырубки древесно-кустарниковой растительности (насаждений), с объектами, подлежащими сносу
